Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАЧЫНЯ—XV
№ 20 (3930)
СЕРАДА, 28 СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

МАГУТНАЯ ХВАЛЯ ПРАТЭСТУ ПРАЦОЎНЫХ БССР

Супроць крывавай оргіі польскай паліцэйшчыны ў Зах. Украіне і Зах Беларусі

„Нашаму абурэнню няма граніц“

Агульны сход курсантаў палявой школы №-скага чырвонасьцяжнага палка з абураньнем пратэстуе супроць катаваньняў азьвярэлымі фашысцкімі катамі рэвалюцыйных рабочых і сялян Зах. Украіны і Зах. Беларусі, якія змагаюцца за вызваленьне з-пад уціску фашысцкай дыктатуры.

Агульны сход канстатуе, што польскі фашызм у саюзе з міжнароднымі імперыялістычнымі драпежнікамі шалёнымі тэмпамі рыхтуецца да ўзброенага нападу на СССР.

Разгром украінскіх і беларускіх культурна-асьветных арганізацый, шалёны тэрор і страшэннае катаваньне адданых рабочай справе барацьбітоў у дафэнзывах і турмах—вось меры падрыхтоўкі паслухмяных тылоў для гэтага нападу.

Актыўнымі дапаможнікамі ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі і задушэньні рэвалюцыйнага руху выступаюць польскія, украінскія і беларускія сацыял-і нацыянал-фашысты, якія выбіваюцца з сіл, каб падтрымаць фашысцкую дыктатуру, якая ўсё больш і больш развальваецца.

Сход курсантаў рашуча пратэстуе супроць зьверскага прысуду фашысцкіх катаў над рэвалюцыйнымі паслами Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу «Змаганьне», якія кінулі гэтых лепшых барацьбітоў на доўгія гады катаргі.

— У адказ на зьдзекі і тэрор крывавага фашызму яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол ленінскай камуністычнай партыі,—сваёрыцца далей у рэзалюцыі,—яшчэ з большым энтузіязмам і энэргіяй будзем узмацняць баявую магутнасьць Чырвонай армії, па-ўдарнаму будзем працаваць над перавыкананьнем плянаў баявой падрыхтоўкі.

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве рэвалюцыйнае змаганьне прапоўных Польшчы, Зах. Украіны і Зах. Беларусі!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы—баявы правадыр працоўных мас!

Далучаем свой голас пратэсту

Рабочыя і работніцы фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна», «Пралетарская перамога» і цэнтральнай электрастанцыі імя Сталіна бязьмерна абураны крывавай расправай вываралай паліцэйшчыны над працоўнымі Зах. Беларусі і Зах. Украіны. Рабочыя і работніцы далучаюць свой голас пратэсту да пратэсту рабочых і сялян БССР.

Калектыў пасылае сваё гарачае пралетарскае прывітаньне барацьбітом за пралетарскую рэвалюцыю.

У адказ на фашысцкія зьверствы рабочыя абяцаюць поўнасьцю выканаць прамфінплян трацяга году пяцігодкі, шырэй разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва і ўсім як адзін уступіць у рады МОПР'у.

Няхай жыве КПП!

Няхай жыве Камінтэрн—штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Толькі пралетарская рэвалюцыя вызваліць працоўныя масы з-пад ярма фашысцкае дыктатуры

Рабочыя і служачыя заводу «Камінтэрн» рашуча пратэстуюць супроць страшэннага катаржнага прысуду над былымі паслами Беларускага рабоча-сялянскага пасольскага клюбу «Змаганьне» і супроць нечалавечых катаваньняў рэвалюцыйных рабочых і сялян Зах. Беларусі і Зах. Украіны у засьценках фашысцкай Польшчы.

Рабочыя патрабуюць спыненьня крывавай оргіі азьвярэлых катаў - дэфэнзыўшчыкаў над рабочымі і сялянамі Зах. Украіны і Зах. Беларусі. Рабочыя добра ведаюць, што гэты тэрор зьвяляецца толькі агульнай часткай падрыхтоўкі капіталістамі вайны супроць СССР і што толькі пралетарская рэвалюцыя вызваліць рабочую клясу і працоўнае сялянства з-пад ярма фашысцкай дыктатуры.

— Мы заклікаем пралетарыят і працоўнае сялянства ня толькі СССР, але і усяго сьвету, узьняць магутны голас пратэсту супроць барбарскіх расправ фашысцкіх катаў над лепшымі прадстаўнікамі рабочай клясы і працоўнага сялянства Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

У адказ на шалёны тэрор фашысцкіх катаў рабочыя нападзіні саботнік на прысьць пабудовы дырыжабля. Акрамя таго, рабочыя абяцаюць усе ўступіць у рады МОПР'у.

Няхай жыве КПП!

Сьмерць крываваму фашызму!

Усе, як адзін, у рады МОПР'у

Калектыў заводу «Спартак», Аршанскага раёну, сабраўшыся на лятучым мітынгу, з абураньнем пратэстуе супроць нечалавечых катаваньняў рэвалюцыйных рабочых і сялян. Зах. Беларусі азьвярэлымі катамі польскага фашызму.

Рабочыя канстатуюць, што тыя вялізарныя дасягненьні, якіх дабілася рабочая кляса і працоўнае сялянства СССР пад кіраўніцтвам партыі Леніна ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, выкананьне пяцігодкі за чатыры гады— выклікаюць несцішаны сярод буржуазіі ўсяго сьвету. Фашысцкая Польшча, перажываючы зараз цяжкі эканамічны крызіс, які ўсё больш паглыбляецца і пераходзіць у крызіс палітычны, адзіны выхад з гэтага становішча бачыць у вайне супроць СССР. Да гэтай вайны польскі фашызм рыхтуецца шалёнымі тэмпамі.

Рабочыя і служачыя заводу ўзьнімаюць свой рашучы голас пратэсту і патрабуюць спыніць нічуваныя зьверствы польскай паліцэйшчыны над палітзьняволенымі фашысцкіх турмаў.

Рабочыя абяцаюць пакласьці ўсе свае сілы на выкананьне трацяга рашаючага году пяцігодкі і ўзмацніць дапамогу палітзьняволеным.

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

Сьмерць фашызму!

БРЫЯН—НА ЧАЛЕ „крыжовага паходу“ супроць СССР

ПАН-ЭЎРОПА—ЗБРОЯ АНТЫСАВЕЦКАЙ ВАЙНЫ

СТРАХ ПЕРАД ПОСЬПЕХАМІ САВЕЦКАЙ ПЯЦІГОДКІ

Стварэньне антысавецкага блёку —галоўная задача пан-Эўропы

ПАРЫЖ, 26. Зауважэйн у «Матэн» у карэспандэнцыі з Жэневы «Чаму Брыян адмовіўся ад фармаваньня габінэту» піша, што «Брыяна папохае мысьль, што, карыстаючыся вельмі сур'ёзным эканамічным крызісам, бальшавізм можа поўнасьцю заўладаць сьветам. Асабліва яго трывожыць становішча аграрных краёў усходняй Эўропы». «Давоўі, па думцы Брыяна, сацыяльнага патрасеньня, каб бальшавізм, ачаг якога знаходзіцца недалёка, заўладаў тэрыторыямі ўсіх краін».

«Вялікую трывогу выклікае ў Брыяна таксама крызіс палітычнага жыцьця Нямеччыны. Таму вялікае значэньне надае Брыян у цяперашні час сваёй міжнароднай дзейнасьці. Аднак, па думцы Брыяна, якраз гэта яго дзейнасьць магла-б падарвець, калі-б ён стаў старшынёю рады міністраў, бо накіраваныя супроць яго нападкі і выпадковасьці ўнутранай палітыкі маглі-б паслабіць яго міжнародны аўтарытэт». «Журналы падае па гэтым-жа пытаньні аналітычнае паведамленьне свайго жэнэўскага карэспандэнта:

«У Францыі, — сказаў Брыян карэспандэнту, — не ўяўляць сабе ў патрэбнай ступені важнасьці эўрапэйскага аб'яднаньня. Ёсьць краіны на ўсходзе і ў цэнтры Эўропы, якія могуць стаць лёгкай здабычай бальшавізму. Мы прыходзім ім на дапамогу... Нам прадстаіць грандыёзная работа. Падумайце толькі аб тым, якія хваляваньні могуць быць рэзультатам савецкага пяцігадовага пляну. Замежная палітыкі даволі, каб заняць поўнасьцю дзейнасьць аднаго чалавека».

Брыян аб мэтах пан-Эўропы

МАСКВА, 26. Парыскі карэспандэнт «Правды» паведамляе: «У заяве друку, якая зроблена ў Жэневе, Брыян, матывуючы свой адказ узяць на сябе фармаваньне габінэту, у прыватнасьці падкрэсьліў, што ўсяцэла заняты пытаньнямі замежнай палітыкі».

«Грамадзкая думка, — заявіў ён, — яшчэ не аддае сабе справы ў важнасьці пан-Эўропы, першыя крокі якой былі-б накіраваны на аказаньне дапамогі прыгнечаным нацыям на Усходзе і цэнтры Эўропы, якія могуць стаць лёгкай здабычай бальшавізму». Такім чынам, паводле афіцыйных размоў самога Брыяна, пан-Эўропа стаць зброяй антысавецкай вайны, і ён стаць на чале гэтага «крыжовага паходу».

Склад новага французкага ўраду

ПАРЫЖ, 27. Згодна паведамленьня агенцтва Гавас, сфармаваны ўрад у складзе: старшыня і міністар унутраных спраў Ляваль, міністар юстыцыі—Бэрар, міністар замежных спраў—Брыян, ваенны міністар — Мажыно, морскі міністар — Дзюмен, міністар авіяцыі—Дзюмэніль, міністар фінансаў — Фландэн, міністар гандлю — Рапен, міністар земляробства — Тардэў і інш. Пост міністра аховы здароўя застаецца пакуль што вакантным. (ТАСС).

Лёкаі французкага імпэрыялізму за „работаю“

ВЕНА, 26. Згодна паведамленьня румынскай газэты «Кувантуль» органа правага крыла нацыянальнай партыі, былы прэмір міністар Маніу выехаў гэтымі днямі ў заграничную паездку па краінах палітычна блізкіх да Румыніі. Гэта паездка стаіць у сувязі з плянам стварэньня пан-Эўропы, а таксама з арганізацыяй антысавецкага блёку з сярэдня-эўрапэйскіх крэдзін. Газэта зазначае, што ў Празе Маніу вёў перагаворы з кіраўніком чэха-славацкага ўраду Бэнэшам і прэзыдэнтам Масарыкам. Масарык у гутарцы з Маніу заявіў, што стварэньне блёку сярэдня-ўсходніх краін зьяўляецца адзінай зброяй барацьбы супроць «сакецкай небясьпекі», а гэта робіць необходным прыстасаваньне Малой Антанты да задач такога блёку. Паводле вестак газэты, Маніу будзе мець спатканьне таксама з Залескім (Польшча), Марынковічам (Югаславія), Брыянам (Францыя), Макдональдам (Англія). Паведамляецца таксама, што Маніу намерен наведаць і Мусаліні. Маніу павінен памацаць магчымасьць італя-румынскага зблiжэньня без ненажаданых крыз гэтым вынікаў для традыцыйнай прыязьні з Францыяй.

НА СХОДЗЕ МЕНСКАГА ПАРТАКТЫВУ

УСЕ СІЛЫ—на выкананьне

ПАСТАНОЎ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

Партактыў даў жорсткі адпор вылазцы апартуніста Смаля

КП(б)Б І ЯЕ ЦК АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЮЦЬ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ

26 студзеня адбыўся сход менскага гарадзкога партактыву, на якім т. Шаранговіч зрабіў даклад аб выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Выступаўшыя у спрэчках таварышы адзначылі, што вызначаны пленумам плян гаспадарчага будаўніцтва на 1931 год поўнасьцю адпавядае пастановам XVI зьезду і сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб далейшым разгортваньні сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце для ажыцьцяўленьня лёзунгу выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Выступаўшыя палкам далучаліся да пастановы ЦКК КП(б)Б аб выключэньні партыі здрадніка ў партыі напыяндартыстаў—Ігнатоўскага і Жылуновіча. Выступаўшыя адзначылі, што КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, асэнсавала вялізарныя посьпехі на фронце ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Партыя, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, выкрыла нацыянал-апартуністаў, іх дробна-буржуазныя тэорыі і яшчэ больш узмацніла сваю бальшавіцкую пільнасьць, яшчэ больш згуртавала свае рады для пасьпяховага змаганьня за выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Т. т. Шлэйтараў, Пятушкоў і Ансюць свае выступленьні прысьвяцілі пытаньням калектывізацыі, падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, пытаньням будаўніцтва і работы гарадзкога гаўету.

Арганізаваць работу з беднякамі і сярэднякамі-адзінаасобнікамі, замацаваць з імі сувязь калгасьнікаў, аказаць максымальную дапамогу калгасам у падрыхтоўцы і правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі, змагацца за новыя посьпехі ў калектывізацыі бядняцка-сярэдняцкіх прыгарадных гаспадарак—залачы ўсе гарпартарганізацыі.

Рад тавары ў адзначалі, што адсутнічае належная работа па падрыхтоўцы да будаўніцтва сёлаву. Будаўнічыя арганізацыі ня жадаюць, дзе і як будаваць. У жыллёвым і камунальным будаўніцтве няма выразнай плянавасьці, у сувязі з чым вельмі часта якасьць будаўніцтва зьвяўляецца нізкай і маюць месца факты перацэнкі і капітальных укладаньняў.

Тав. Агульнік, паказаўшы на вялізарныя задачы, якія паставілі студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б перад усёй КП(б)Б і рабочай клясай, падрабязна спыніўся на пытаньнях работы саветаў і ў прыватнасьці на рабоце Менскага гарсавету. Калі перагрэгаваньні і прафсаюзы ў асноўным перабудавалі сваю работу, выхопіўшы з залёту пазадзеўняшняга перыяду, пакінуты ім у спадчыну ад немагчымасьці прадаліся тварам да вытворчасьці, дык гэтага лічыць не зрабілі саветы. Тав. Агульнік расцэньвае выступленьне Ансюць па пытаньні работы гарадзкога савету яўна недаваньняшнім. «Тав. Ансюць—кажа т. Агульнік—ня выкрыў і не раскрытыкаваў апартуністычных скажэньняў, якія былі дапушчаны гарсаветам у радзе пытаньняў і ня знайшлі адбітак у «славутай» справаздачы».

З права-«лявацкай», паклёпніцкай прамовай выступіў у спрэчках т. Смаль, які імкнуўся даказаць, што ў КП(б)Б не разгорнута самакрытыка, што крытыкаваць можна толькі нізавых работнікаў, абвінавачваў партыю на радзе другіх пытаньняў.

Гаворачы аб рабочым забесьпячэньні, Смаль меў нагласьць сьцьвярджаць, што ў сувязі з адабраньнем агародаў ад абываталяў у Менску і ў іншых гарадох БССР рабочыя засталіся без гародніны. У гэтым сьцьвярджэньні выразна выяўляецца жаданьне Смаля абараніць кулацкія элементы. Гэта выступленьне было накіравана супроць калектывізацыі, супроць плянавага забесьпячэньня пралетарскіх центраў гародніной.

Смаль, гаворачы аб труднасьцях, ні слова не сказаў аб тым, што нашы труднасьці зьвязаны з ростам сацыялізму, з жорсткім клясавым змаганьнем. Смаль знаходзіць, што ні дакладчык, ні другія прамоўцы «не далі аналізу, а толькі канстатуюць, што ў нас труднасьці, а канкрэтна не паказваюць, што трэба зрабіць, каб гэтага ня было». Смаль у завуаляванай форме прабаваў абвінаваціць партыю і яе ЦК у тым, што партыя ня прымае лініях захапаў, каб выпісьці з труднасьцяй, каб іх пераматчы. Пад такім сьцьвярджэньнем з яўлікай ахвотай могуць падпісацца апартуністы ўсіх колераў разам з клясавым ворагам—кулаком.

Далей Смаль прабаваў абвінаваціць КП(б)Б, што быццам яна няжорстка і нерашуча змагаецца са шкоднікамі. Смаль быццам-бы не разумее, што да тых часоў, пакуль у нашай краіне ёсьць клясавы вораг, ёсьць кулацкія элементы, якія ўсялях імкнуцца перашкаджаць сацыялістычнаму будаўніцтву, шкодніцтва можа мець месца як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Смаль ні ў горадзе, ні ў вёсцы ня бачыць клясавага змаганьня, ня бачыць шалёнага супраціўленьня клясавага ворага сацыялістычнаму наступленьню, а таму прыходзіць да вываду, што партыя невыстарчальна змагалася со шкоднікамі. Такое сьцьвярджэньне зьяўляецца тыповым выступленьнем заядлага апартуніста.

Смаль недапушчальна і бесадэтаўна абвінавачваў ЦК у запісу самакрытыкі. Смаль тут-жа чаўтаў старыя ўрадзіцкія пазыцыі аб немагчымасьці прыгадаў калгасам прывяла да таго, што насельніцтва застадося біз гуркоў і буракоў—так можа гаварыць толькі клясавы вораг. Тав. Будзінскі разам прыкладаў разьбіце доводы Смаля аб тым, што партыя не змагалася са шкоднікам у прамысловасьці і сельскай гаспадарцы.

— Наша партыя ніколі ня была маўчальніцай і таму ніхто ня мае права кідаць арганізацыі абвінавачаньне, што яна зьяўляецца маўчальніцай. Гэта клёп на нашу арганізацыю. Наш актыў малады, але ён выхаваны бальшавіцкай ленінскай партыяй.

Тав. Будзінскі выступленьне Смаля расцэньвае, як кулацкае, права-«лявацкае» выступленьне, за якое трэба жорст ка біць.

У заключным слове тав. Шаранговіч падрабязна спыніўся на рабоце КП(б)Б па калектывізацыі, на далейшай задачы ў сувязі з пастановамі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Тав. Шаранговіч даў рашучы адпор права-«лявацкаму» наскоку Смаля на лінію КП(б)Б і на яе ЦК.

Сход партыйнага актыву прыняў рэзалюцыю, у якой палкам далучыўся да бальшавіцкіх пастаноў студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, вызначыў рад чарговых задач Менскай гарадзкой партарганізацыі і асудзіў антыпартыйнае выступленьне Смаля.

ПАБУДУЕМ САВЕЦКІЯ ДЫРЫЖАБЛІ

На пагрозы імпэрыялістаў запасьць на СССР рабочая кляса і прапоўнае сялянства БССР адказваюць разгортваньнем кампаніі па зборы сродкаў у фонд дырыжабляпабудаўніцтва.

Так, працоўнае сялянства вёсак Востраўсзага сельсавету, Сьвісляцкага раёну, добраахвотна ўносяць у фонд абароны краіны наступныя сумы: в. Н.-Востраў —10 р. 65 к., Востраўская вячэрняя школа—10 руб., Н.-Сяло—9 р. 32 к., вучні дзённай школы Вострава—4 р. 30 к., в. Востраў—22 руб.

Калгасная моладзь Н.-Вострава і Ч.-Вострава сабрала у фонд абароны краіны 16 р. 72 кап. Апрача гэтага моладзь калгасаў у першы дзень калёд наладзіла субстэнт, на які зьвялілася 42 чал. Заробленыя грошы ўнесены ў фонд абароны краіны.

Калгасьнікі в. Замран супольна з адзінаасобнікамі ў дзень калёд наладзілі чырвоны абед. На пасажатоўцы выехалі 72 фурманкі, прычым увесь заработак унесен у фонд абароны краіны.

Яшчэ шырэй разгарнулі кампанію па зборы сродкаў калгасы Якшыцкага сельсавету гэтага-ж раёну. Так, калгас «Перамога» ўнёс у фонд абароны краіны 30 руб. і выклікаў калгасы в. в. Вычына, Гаранка, Перавоз, Прыцерла і Цяжаху, Якшыцкага сельсавету, пасьледаваць яго прыкладу.

У вёсцы Н.-Востраў створан калгас з 12 гаспадарак, у часе правядзеньня антыкалядная кампаніі з яго ўступілі яшчэ 4 сялянскія гаспадарки.

Я. Кунцэвіч.

— Грамадзяне м. Сухары, Чарнеўскага сельсавету, уносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 56 р. 93 к.

— Супрацоўнікі Дрысенскай раённай міліцыі ўносяць на пабудову дырыжабля «Правда» 2 проц. месячнай пэнсіі.

— Супрацоўнікі Вульскай раённай міліцыі і крымвышуну ўносяць 72 р. на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» і выклікаюць рэшту супрацоўнікаў раённай міліцыі пасьледаваць іх прыкладу.

— Хатнія гаспадыні жанку № 3 (Менск) уносяць на пабудову дырыжабля «Правда» 36 руб. і выклікаюць хатніх гаспадынь іншых жанкаў пасьледаваць іх прыкладу.

ЗАКРЫЎСЯ IX УСЕСАЮЗНЫ ЗЬЕЗД КАМСАМОЛУ

26-га студзеня закрыўся IX усесаюзны зьезд УсеЛКСМ.

Зьезд паслаў прывітаньні Камінтэрну, а таксама гэрайчнаму кітайскаму камсамолу і ў сувязі з узнагародай ордэнам працоўнага Чырвонага Сьцягу прыслаў віншаваньне ад камсамолу і рабоча-сялянскай моладзі СССР.

Акрамя таго зьезд прыняў пастанову аб вымене праграмы УсеЛКСМ, як неадпавядаючай узросным задачам саюзу, пазбаўў годнасьці ганаровых камсамольцаў Шацкіна, Чапліна і Цэйтліна, як не апраўдаўшых давер'я УсеЛКСМ, і пастанавіў лічыць выбары ганаровых камсамольцаў надалей намінальнымі.

Зьезд зацьвердзіў у канчатковай рэдакцыі рэзалюцыі па дакладах т.т. Джаныбэка Сяргэйдзе і Сергіняевай. Была таксама аднагалосна зацьверджана рэзалюцыя па дакладу ЦК УсеЛКСМ, якая прызнае палітычную лінію ЦК правільнай і ўхваляе яго работу.

На заключным пасяджэньні зьезду з прамовамі выступілі т. Капінін, спатканы бурнай авацыяй, а таксама т. т. Швернік і Бубнеў. Аднагалосна была зацьверджана прапанова позьдзіўнага зьезду аб тым, што канфліктныя камісіі камсамолу выбіраюцца на пленумах камітэтаў.

Новы склад ЦК УсеЛКСМ выбран у ліку 82-х чал. і 30 кандыдатаў. Рэвізійную камісію выбрана 12 чалавек.

Закрываючы зьезд, т. Косараў зрабіў кароткую заключную прамову.

Пасьля закрыцьця зьезду адкрыўся пленум выбранага Цэнтральнага Камітэту УсеЛКСМ.

6 зьезд саветаў склікаецца ў сакавіку

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК СССР 6 зьезд саветаў Саюзу ССР назначаецца на 5 сакавіка 1931 году ў Маскве.

Парадак дня: 1. Даклад ураду СССР; 2. Пытаньні савецкага будаўніцтва; 3. Справаздачны даклад ВСНГ Саюзу ССР аб цяжкой прамысловасьці (матэрыял і апал); 4. Справаздачны даклад Наркамзвеншмера; 5. Даклад Наркамзему Саюзу ССР, Калгасцэнтру і Трактарацэнтру аб калгасным будаўніцтве; 6. Даклад Наркамзему СССР, «Зернотрэста» і жывёлагадоўчых саўгасных трэстаў аб саўгасным будаўніцтве; 7. Пытаньні канстытуцыі СССР; 8) Выбары членаў Саюзнага савету і зацьверджаньне чланай савету нацыянальнасьцей.

РАЗГУЛ БЕЛАГА ТЭРОРУ Ў ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

ГАЛАДОЎКА ПАЛІТВЯЗЬНЯЎ У ГОРАДНІ

Як паведамляе «Роботнік»—орган польскага сацыял-фашызму—у № 30 ад 22-га студзеня, у Гарадзенскай турме ўжо некалькі дзён працягваецца галадоўка палітвязьняў. Выбухнула яна з прычыны пазбаўленьня тых правоў, якіх палітвязьні дабіліся шляхам шматгадовай упартай барацьбы, як пазбаўленьне газэт, кніг, пазбаўленьне карыстацца ўласнай вопраткай і інш.

Для навядзеньня парадку выклікана паліцыя.

Так суха і кароткa паведамляе сацыял-фашысцкі брахун.

Крытычныя каты не алавальняюцца катаваньнямі і забойствамі палітарыштаваных у засьценках дэфэнзывы, яны імкнуцца ў турме ператварыць іх страшэннымі катаваньнямі у «безгласных» чырвоныя трупы. Для такой фабрыкацыі трупаў і прыехаў у Гарадзенскі астрот новы начальнік, вядомы турэмны кат—Грабоўскі. Ня так даўно ў Любліне ён упаснарўчна забіў палітвязьня.

З першых дзён ён пачаў праводзіць новы фашысцкі турэмны рэгулямін. Сярэдня-вяковая інквізацыя не дадумалася да такіх прыніжаючых годнасьць чалавека абдзекаў, і катаваньняў, да якіх дайшоўся гэты верны пёс польскага фашызму.

Палітвязьняволеныя пазбаўляюцца ўсіх кніг і газэт. Турэмшчыкі ў адносінах да палітвязьняў праводзяць сваю асаблівую «нацыянальную палітыку», адзяляючы яўрэяў ад беларусоў, а таксама інтэлігэнтаў ад рабочых, а тых і другіх—ад сялян. Харчовыя камуны, якія існуюць сярод палітвязьняў узнадоўгія галы, зараз рашуча ліквідуюцца. Пагулянкі скарачаюцца да некалькіх хвілін. Турэмны паёк на столькі галодны, што палітвязьняволены без падтрыманьня сваякоў не пражывае і некалькі месяцаў.

Турэмная адміністрацыя спэцыяльна выклікае галадоўкі, каб фізычна хутчэй зьнясіліць палітвязьняў. Але ніякія турэмныя рэгуляміны фашысцкіх катаў ня аломуць рэвалюцыйнай волі гарачых палоньнікаў капіталу.

Барацьба палітвязьняў у Горадні зьвяляецца часткай агульнай барацьбы, якую вядуць увесь час супроць фашысцкага наступленьня палітвязьняволеных ўсіх польскіх турмаў.

Грабежніцтва сярод белага дня

Гаспадарчы занепад у фашысцкай Польшчы з кожным днём усё больш і больш павялічваецца. Вострыя крызісе зямляробства, які супаў і пераплёўся з крызісам прамысловым, руйнуе ў шчэнт прапоўнае сялянства. Цэны на асноўныя прадукты зямляробства ўпалі на 60-70 проц. Вялізарныя падаткі, якія фашысцкі ўрад выціскае на ўзбраеньне і падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР перавяжна з прапоўнага насельніцтва, прымушаюць сялян прадаваць ня толькі апошні пуд збожжа, але і аддаваць сябе ў кнпюры розных спэкулянтаў і ліхвяроў. На Зах. Беларусі і Зах. Украіне гэты эканамічны цяжар яшчэ больш павялічваецца, бо там праводзіцца калёніяльная палітыка фашысцкіх урадам.

Такое немагчымае становішча, відома, ня можа ня выклікаць адпору з боку сялян.

Фашысцкі «Кур'ер Віленскі» ў № 26 паведамляе, што сяляне Гэдуцкай воласьці, усе як адзін, адмовіліся плаціць падаткі. На большасьць вёсак, як зграя груганоў, накінулася цэлая армія сэквэстратараў—зборшчыкаў падаткаў. З жабрацкага сялянскага здабытку яны забіралі апошняе, выязджаючы з-пад лаяцей нават падушкі. На працягу аднаго дня было зроблена 100 падатковых экзэкуцый. За спробы даць адпор паліцэйшчыны зьбівала насельніцтва цэлых вёсак.

Трэба адзначыць, што такога роду акацыі ў Зах. Беларусі не адзіночны выпадак, а штодзённая зьява. Такое грабежніцтва сярод белага дня прапоўнага сялянства адбываецца ложны дзень на працягу ўжо 12 год.

Новыя ўзбраеньні паліцыі

Як піша «Кур'ер Віленскі» ў № 20, фашысцкі ўрад Польшчы праводзіць узбраеньне паліцыі паводле апошняга слова ваеннай тэхніцы.

Фашысцкі орган яўсім ня утоўнае, што гэта ўзбраеньне накіравана выключна для задушэньня рэвалюцыйнага руху, магутны рост якога можа ўдарыць па панаваньні фашысцкай дыктатуры. Для разгону рэвалюцыйных мітынгаў пралетарыяту і працоўнага сялянства выдаюцца ўзбраеньні ваеннага тылу, забясьпечваецца сталёвымі панцыранымі, ручнымі кулямётамі і газавымі бомбамі.

Усе гэтыя меры сьведчаць аб слабасьці фашысцкай дыктатуры, яны ня толькі ня спынілі, а наадварот яшчэ больш павялічаць рэвалюцыйнае змаганьне працоўных Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны супроць дыктатуры фашызму.

ПЕРАМОГУ ТЭХНІЧНЫМ КУЛЬТУРАМ—



забясьпечым давядзеньнем вытворчых плянаў да кожнага калгасу, бядняцка - серадняцкага двара, 100-процантнай ссыпкай насенных фондаў, поўным выкананьнем загатовак ільну і канапель

КАНТРАКТАЦЫЮ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ ПЕРАТВОРЫМ У МАГУТНЫ СТЫМУЛЬ ДЛЯ НОВАГА УЗДЫМУ КАЛГАСНАГА РУХУ І ПАДРЫХТОЎКІ ДА БАЛЬШАВІЦКАЙ СЯЎБЫ

Калгасы БССР, бярэце прыклад з калгасу „ЗАВЕТ ЛЕНІНА“ і камуны імя БВА, якія павялічваюць плошчу тэхнічных культур!

Прэміраваны ўдарнік саўгасу Тарасава т. Баравік.

Ільнаводчая каапэрацыя АДКАЗВАЕ ЗА ПОСЬПЕХ СЯЎБЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

Бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці ращуча высоўвае пытаньне аб найхутчэйшай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, аб аб'яднаньні раздробленых спажывецкіх гаспадарак у буйныя сацыялістычныя гаспадаркі, якія здолеюць забясьпечыць як патрэбы рабочае клясы прадуктамі харчаваньня, так і сацыялістычную прамысловасьць сырцом.

Надыходзячая другая бальшавіцкая вясна павінна ў значнай меры вырашыць гэтыя пытаньні.

Надзвычайныя задачы ў гэтым годзе стаяць перад сыстэмай ільнаканаплаводчай каапэрацыі. Яна ў першую чаргу нясе адказнасьць за выкананьне плянаў пасеву тэхнічных культур.

У 1931 годзе на палёх БССР павінна быць пасеяна 240 тыс. гэкт. ільну — на 80 проц. больш у параўнаньні з мінулым годам. Удзельная вага пасеваў ільну ў калгасах і саўгасах узрасьце ад 15 проц. у 1930 г. да 37 проц. у 1931 г. Яшчэ больш рэзкую зьмену ў процантных суадносінах мы маем па канопляхі, па якіх пасоўная плошча павялічваецца на 100 проц., а сацыялістычны сэктар у агульнай масе пасеваў зойме —39 проц.

Асноўныя колькасьць пасеваў ільну прыпадае на раёны б. Полацкай, Віцебскай і Аршанскай акруг, на тэрыторыі якіх будзе засеяна 148.000 гэкт. ільну, з іх — 54.549 гэкт. у калгасах.

Загатовіць і адсартаваць 7.300 тон насеньня ільну

Паданыя вышэй лічбы сьведчаць аб грандыёзнасьці плянаў работы, для выкананьня якіх павінна быць мабілізавана зараз уся грамадзкасьць бядняцка-серадняцкія масы вёскі.

Становішча падрыхтоўкі да сяўбы ў ільнаводчых раёнах на сёньняшні дзень прымушае нас настаражыцца. Засьпка насенных фондаў ільну па калгасах праходзіць надзвычай нездавальняюча. На 15 студзеня 1931 г. плян у гэтай частцы выкананы усяго на 29 проц. Слаба ідзе работа па стварэньні страхавых фондаў. Зусім нездавальняюча праходзяць загатоўкі і адбор насеннага матар'ялу ільну. На 20 студзеня г. г. па 90 раёнах загатоўлена 28 проц. плянавага заданьня.

Перад усімі раённымі саюзамі сельска - гаспадарчай каапэрацыі, перад ільнаканапляводчай каапэрацыяй у сукупнасьці з гэтым стаіць надзвычай важная і адказнейшая задача — загатовіць і адсартаваць 7.300 тон насеннага матар'ялу ільну.

Яшчэ горш справа на сёньняшні дзень з засьпкай насенных фондаў у калгасах, стварэньнем страхавых фондаў і загатоўкай насеннага матар'ялу канапель.

Ні аднаго грама канапель — на спажываньне

На 15 студзеня 1931 г. плян загатоўкі насеннага матар'ялу канапель выкананы ў разьмеры 25 проц. Таму намі зараз-жа павінны быць прыняты энэргічныя меры для выкарыстаньня ўсіх мясцовых магчымасьцяй. У першую чаргу трэба стварыць на мясцох такія ўмовы, пры якіх-бы ні адзін грам канапель не пайшоў у спажываньне, а захоўваўся для пасеву ці здаваўся загатоўчым арганізацыям. Загатоўленыя канопелі павінны быць ачышчаны і захаваны так, каб да апошняга зерня маглі быць выкарыстаны для пасеву. Трэба неадкладна правесьці усхожасьць запасаў канапель мінулага году і забясьпечыць далейшае іх захоўваньне. Трэба і неадкладна забясьпечыць пройміваньне здатчыкаў канапель маслам.

Агрыкультурная і агравытворчая работа

Рашучая ўвага павінна быць аддана агрыкультурнай і агравытворчай рабоце. Трэба стварыць такія ўмовы, пры якіх не на словах, а на справе ўвесь пасеўны матар'ял і ў першую чаргу на сеньне ільну і канапель, сапраўды быў-б ачышчаны. Калгасы і індывідуальныя гаспадаркі павінны сеяць толькі ачышчаным насеньнем.

Машын для ачысткі насеньня ў нас, у БССР, надзвычай мала, а ільнаачышчальныя трыеры па пальцах можна пералічыць. З гэтае прычыны рацыянальнае і поўнае іх выкарыстаньне — важнейшая задача. Як правіла, усе збожжаачышчальныя машыны мінімум павінны працаваць на дзьве зьмены, а дзе гэта трэба па мясцовых умовах — і ў тры зьмены. Ва ўсякім выпадку ачыстка каапэрацыйнага насеннага матар'ялу зараз-жа павінна быць пераведзена НА ДЗЬВЕ І ТРЫ ЗЬМЕНЫ для таго, каб пасьля ачысткі свайго збожжа перавесьці машыны для абслугоўваньня калгасаў і індывідуальнага сэктару.

Не забываць пра попел

Другое пытаньне — гэта аб выкарыстаньні мясцовых угнаеньняў. У гэтым годзе, у параўнаньні з мінулым — мінеральных угнаеньняў завозіцца значна больш, але іх будзе мала для поўнага задавальненьня нашых патрэб. Таму трэба ў першую чаргу выкарыстаць мясцовыя магчымасьці.

Вопытамі мінулых год даведзена, што калійную соль і сільвініт можа замяніць попел. Каб не паўтараць мінулых памылак, калі ў самы разгар сяўбы і бездарожжа на Мар'інскія масывы трэба было завозіць попел з Бабруйску і іншых месц, — трэба за гэту справу ўзяцца зараз-жа. Асабліва вялікую ролю ў мінулыя гады ў гэтым адыграў камсамол, трэба, каб і ў гэтым годзе камсамол быў у першых радох змагароў за тэхнічныя культуры.

Тарфаваньне, і асабліва вапнаваньне, у мінулыя гады зрывалася. Трэба, каб у гэтым годзе пляны гэтых мерапрыемстваў былі праведзены поўнасьцю. Ва ўсякім выпадку ні ў якім разе недапушчальна такое становішча, калі вапна застаецца нявыкарыстанай дзесяткамі тысяч тон, а пляны вапнаваньня глебы зрываюцца. Райкаапсаюзы зараз-жа павінны вылучыць спэцыяльных адказных асоб для кіраўніцтва і выкананьня гэтай работы.

Каапэраваць 85 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, што не ўвайшлі ў калгасы

Посьпех правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі ў асноўным залежыць ад нашай арганізацыйнай падрыхтаванасьці. Калгасы, пад кіраўніцтвам ленінскае партыі, будуць у асноўным вырашаць посьпех веснавой сяўбы. Але ва ўмовах БССР застанецца яшчэ значная частка бядняцка - серадняцкіх гаспадарак вёскі, неахопленых калгасамі, і кіраўніцтва гэтай часткай вёскі павінна быць поўнасьцю забясьпечана з боку раённых і сельскіх арганізацый. У практычным абслугоўваньні гэтай часткі сельскіх гаспадарак асноўную ролю павінны адыграць першапачатковыя вытворчыя таварыствы. Недаацэнка іх ролі і значэньня ні ў якім разе ў далейшым нецярпіма. У галіне вытворчага каапэраваньня ільнаводчай каапэрацыяй плян асобнага кварталу выкананы толькі НА 25 ПРОЦ. Да пачатку веснавой пасеўнай кампаніі, ва што-б там ні стала, ПАСТАНОВА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б АБ 85%-м КААПЭРАВАНЬНІ БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК ВЁСКІ, НЕ ЎВАЙШОЎШЫХ У КАЛГАСЫ, — ПАВІННА БЫЦЬ ВЫКАНАНА.

***

Для выкананьня пастаноў партыі і ўраду ў галіне веснавой сяўбы тэхнічных культур павінны быць мабілізаваны ўсе сілы і сродкі.

Рашучы адпор павінен быць дан пакінёрам і малаверам, якія бируць пад сумненьне раальнасьць плянаў і магчымасьць іх выкананьня. Праводзячы работу бальшавіцкімі тэмпамі, бируючы пад жорсткі агонь крытыкі і самакрытыкі нашы промахі і недахопы, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б плян сяўбы тэхнічных культур павінен быць і будзе выкананы.

ЛАЦІС.

Камуна імя БВА ПАТРАБУЕ УВАГІ ЧАКАЕМ АДКАЗУ НАРКАМЗЕМА т. РАЧЫ'КАГА

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ КАМУНА ІМЯ БВА НА МАР'ІНСКІМ МАСЫВЕ Ў МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ЗАСЕЯЛА 327 ГЭКТАРАЎ ЯРАВОГА КЛІНУ. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ ПРАДУГЛЕДЖВАЮЦЬ ПАШЫРЭНЬНЕ ЯРАВОГА КЛІНУ КАМУНЫ ДА 1.175 ГЭКТАРАЎ.

СПАЧАТКУ НЕКАТОРЫЯ КАМУНАРЫ ПРАБАВАЛІ ЗАЯЎЛЯЦЬ, ШТО ПЛЯН ГЭТЫ НАДТА ПАВЯЛІЧАНЫ І НЕМАГЧЫМЫ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ.

АЛЕ ПАСЬЛЯ ДЭТАЛЬНАГА АБМЕРКАВАНЬНЯ ПЛЯНУ НА САВЕЦЕ КАМУНЫ СУПОЛЬНА З АКТЫВАМ КАМУНАРАЎ БЫЛО ПАСТАНОЎЛЕНА ПАВЯЛІЧЫЦЬ КАНТРОЛЬНЫ ПЛЯН РАЙВЫКАНКОМУ НА 30 ГЭКТАРАЎ І ЗАСЕЯЦЬ У ЧАСЕ ДРУГОЙ КАЛГАСНАЙ ВЯСНЫ 1.205 ГЭКТАРАЎ.

КАМУНАРЫ ЗАРАЗ ПРЫМАЮЦЬ УСЕ МЕРЫ ДА ТАГО, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТАГА ПЛЯНУ. РАЗГОРНУТ РАМОНТ ІНВЭНТАРУ НЯ ТОЛЬКІ СВАЙГО, АЛЕ І СУСЕДНІХ КАЛГАСАЎ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

ЗАРАЗ КАМУНАРАЎ ТУРБУЕ ТОЛЬКІ АДНА СПРАВА—ЦІ АТРЫМАЮЦЬ ЯНЫ 9.000 ЦЭНТЫЭРАЎ КАЛІЙНЫХ УГНАЕНЬНЯЎ, ЦІ АТРЫМАЮЦЬ ЯНЫ ПАТРЭБНАЕ НАСЕНЬНЕ.

РАЕННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА НЕАДНАРАЗОВЫЯ ПАТРАБАВАНЬНІ КАМУНЫ, НЕ ДАЮЦЬ АДКАЗУ НА ГЭТЫЯ ВАЖНЕЙШЫЯ ПЫТАНЬНІ.

МЫ ЗВАРАЧАЕМСЯ СЁНЬНЯ ДА НАРКАМЗЕМА БССР Т. РАЧЫЦКАГА З ПРОСЬБАЙ ДАЦЬ АДКАЗ, ШТО РОБІЦЦА ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ Ў КАМУНЕ ІМЯ БВА.

ТРЭБА ЗАРАЗ-ЖА ПРЫНЯЦЬ ЗАХАДЫ ДА ТАГО, КАБ НЕ ПАЎТАРАЦЬ ЛЕТАШНІХ ПАМЫЛАК, КАЛІ Ў САМЫ РАЗГАР СЯЎБЫ І БЕЗДАРОЖЖА ПРЫШЛОСЯ ПЕРАВОЗІЦЬ УГНАЕНЬНІ І ПОПЕЛ НА МАР'ІНА З ІНШЫХ РАЕНАЎ БССР.

МОДЗІН.

Усебеларуская нарада дырэктароў і аграномаў МТС

МТС—НАСУСТРАЧ КАЛГАСНАЙ ВЯСЬНЕ

Апартуністычная недаацэнка ролі МТС

Набліжаюцца дні другой бальшавіцкай вясны.

Заданьні партыі і ўраду па веснавой сяўбе і калектывізацыі намячаюць вялікую праграму дзеяньняў для саўгасаў, калгасаў, МТС і адноасобных гаспадарак.

Выключнае значэньне пры правядзеньні другой бальшавіцкай вясны маюць МТС.

Як-жа МТС БССР пераключыліся на выкананьне баявых заданьняў партыі? Наколькі гэтыя апорныя пункты калектывізацыі забясьпечаны неабходнымі ўмовамі для выкананьня грандыёзных задач бальшавіцкай сяўбы?

Па гэтым пытаньні даюць адказ сіроўкі на дакладах т.т. Рачыцкага і Маца на першай усебеларускай нарадзе аграномаў і дырэктароў МТС.

Рад МТС на тэрыторыі БССР далёка яшчэ ня сталі сапраўды апорнымі пунктамі ў змаганьні партыі і рабочае клясы за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Некаторыя раённыя арганізацыі, на тэрыторыі якіх знаходзяцца МТС, слаба выкарыстоўваць іх у барацьбе за калектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Характэрны прыклад недаацэнкі МТС прыведзен на нарадзе дырэктарам АСЬВЕЙСКАЙ МТС. У Асьвейскім раёне меў месца такі факт, калі аднаго з адказных работнікаў раёну за праяву права-апартуністычнае практыкі зьнялі з работы. І вось РК КП(б)Б пастанавіў: «Накіраваць яго на нядаказную работу ў якасьці інструктара масавай работы ў МТС» (?!) (пратакол № 18 ад 27-XII 1930 г.).

Такія факты ігнараваньня МТС, недаацэнкі іх ролі зьяўляюцца не адзінкавымі. Капыльскі райкалгассаюз пакіраваў на работу у МТС агранома які ня справіўся са сваімі задачамі ў часе работы ў райкалгассаюзе.

На лепшыя адносіны да МТС нагладаюцца і ў Расьнянскім, Капыльскім і Аршанскім раёнах, дзе забясьпечаньне МТС лесаматар'ялам, кадрамі і іншым лічаць другарадным справай.

На курсы трактарыстаў пасылаюць прагульшчыкаў

Наогул з укамплектаваньнем штатаў і падрыхтоўкай кадраў для МТС справа стаіць з рук вон дрэнна. У раёнах панае тэндэнцыя, што «цэнтр абавязан укамплектоўваць МТС», а таму раёны зусім халатна адносяцца да пытаньня падрыхтоўкі кадраў і да ўкамплектаваньня штатаў. Гэта прывяло да таго, што большасьць МТС на сёньняшні дзень яшчэ не ўкамплектавана мінімальным пікам работнікаў.

Яшчэ горш стаіць справа з падрыхтоўкай як старшых, так і малодшых рулявых мэханікаў. Папершае, рад раёнаў (Аршанскі, Старобінскі, Жыткавіцкі інш., яшчэ ня прыступілі да арганізацыі курсаў па падрыхтоўцы іх. Арганізаваныя курсы (Заслаўль, Капыль, Горкі, Асьвея) укамплектоўваюцца вельмі дрэнна. Вакол пытаньня ўкамплектаваньня курсаў не мабілізавана ўвага калгасаў. На курсы пасылаюцца ня лепшыя калгаснікі-ўдарнікі, а, наадварот, горшыя з горшых — прагульшчыкі, сымулянты.

Будаўніцтва МТС разгортваецца марудныміі тэмпамі. Літаральна няма ні аднаго раёну, ні аднае МТС, дзе-б будаўніцтва ішло поўным ходам. Асьвейская МТС нават на сёньняшні дзень ня ведае цэнтру свайго вучастку. Такое-ж становішча і ў Сьміловіцкай, Лёзьненскай і Старадарожскай МТС.

Нават загатоўкі матар'ялу для будаўніцтва ня робяцца. Вялікая віна ў гэтай справе прыпадае і на долю Трактарацэнтру і Наркамзему. Да гэтага часу гэтыя арганізацыі не дагаварыліся з Лесбелам аб здачы-прыёмкі нарадаў МТС, што прывяло да таго, што сыстэма Лесбелу не адпускае будаўнічых матар'ялаў.

Зламаць праваапартуністычныя тэндэнцыі

Дагаворная кампанія з калгасамі і адноасобнікамі толькі што пачынаецца. Ня гледзячы на вялікае палітычнае значэньне гэтай кампаніі, у радзе месц яна разгортваецца чарапашымі тэмпамі. Вакол дагаворнае кампаніі не мабілізоўваюцца шырокія масы калгаснікаў, бядняцка-серадняцкія гаспадаркі вёскі. Ёсьць і такія раёны, якія яшчэ і ня думаюць прыступаць да дагаворнае кампаніі (Сьміловіцкі, Лёзьненскі, Будаканаплеўскі і інш.).

Пуціе неразуменьне палітычнай сутнасьці кампаніі нагладзецца ў Асьвейскім раёне. Замест таго, каб па-бальшавіцку ўзяцца за растлумачальную работу ня ігнараваць пытаньні, якія ставяць калгаснікі, а ўзмацніць барацьбу за выкананьне баявых заданьняў партыі? Наколькі гэтыя апорныя пункты калектывізацыі забясьпечаны неабходнымі ўмовамі для выкананьня грандыёзных задач бальшавіцкай сяўбы?



Рамантуюць трактары

На лепшыя адносіны да МТС нагладаюцца і ў Расьнянскім, Капыльскім і Аршанскім раёнах, дзе забясьпечаньне МТС лесаматар'ялам, кадрамі і іншым лічаць другарадным справай.

Такая недаацэнка ролі МТС, правядзеньня рамонтных работ ня ведаюць, дзе, хто і наколькі мае патрэбу ў рамонце. Гэта прыняло да таго, што рамонтная кампанія зацягваецца. На сёньняшні дзень ні адна МТС не дасягнула 25 проц. выкананьня рамонту. Ёсьць і такія МТС, якія зусім ня прыступілі да рамонту (СТАРЫЯ ДАРОГІ, ЛЕЗНА). Такім чынам, ствараецца рэальная пагроза, што тэрміны рамонту, устаноўленыя ЦК КП(б)Б, будуць упушчаны.

Невыстарчальная работа ў галіне збору сродкаў на трактары, невыкананьне плянаў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру — лепшы довад недаацэнкі значэньня МТС. Ганебнейшы факт. Ні ў адным раёне не рэалізаваны акцыі Трактарацэнтру поўнасьцю. Большасьць раёнаў ня ўключыла рэалізацыі акцый у раённы плян мабілізацыі сродкаў.

Ясныя адносіны да МТС, слабасьць работы па заключэньні дагавораў, дрэнная падрыхтоўка кадраў для МТС, забыцьцё пра масаву работу—па сутнасьці ўсё гэта зьяўляецца сваласьлівай праявай апартуністычных тэндэнцый да работы МТС.

Больш бальшавіцкай самакрытыкі

Задачы МТС у надыходзячай другой калгаснай вясьне на-бальшавіцку вырашаліся нарадай дырэктароў і старшых аграномаў МТС.

Разам з гэтым нельга не адзначыць аднаго з недахопаў у рабоце нарады. Над агонь бальшавіцкай крытыкі браліся цэнтральныя ўстановы, раённыя арганізацыі, але вось бальшавіцкай самакрытыкі было мала. Наглядалася тэндэнцыя ўвальваньня прычын усіх недахопаў і праяваў у рабоце МТС на раённыя арганізацыі і г. д. Але вось, ні адзін з дырэктароў (за выключэньнем дырэктара Лепельскага МТС) самакрытычна не падыходзіў да сваіх недахопаў. Між тым, ёсьць такія факты, якія сьведчаць аб тым, што нашы дырэктары не пасьпешна прымалі ўсе магчымыя захады, каб папрадхіць той ці іншы прагул.

Хто-ж вінават у тым, што ў Лёзьне 5 трактараў стаялі пад сьнегам? Безумоўна, што вінаватыя станцыі.

Многія дырэктары лічылі лішнім дабівацца да канца выраўнаньня справы. Такая пастаноўка пытаньня кідуць на парта.

Толькі ажыцьцяўленьне адзінаначальля ў МТС і належнае кіраўніцтва з боку дырэктараў станцый пры падтрыманьні іх раённымі арганізацыямі і пры шырокім удзеле ў рабоце МТС калгасных мас будзе забясьпечана выкананьне задач, што стаяць перад МТС, як асноўных вагароў сацыяльнае калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы.

І. ЛЯЎКОВІЧ.

Сарачаюцца за „партфэль“

Назіраецца поўная адсутнасьць кантакту ў рабоце паміж МТС і райкалгассаюзамі. Паміж імі ідуць частыя сперчкі за кіраўніцтва, як кажуць, за «партфэль». Такія непаладкі ў рабоце прыводзяць да таго, што Горацкая МТС зусім самастойна праводзіць сваю работу, ігнаруючы мясцовыя арганізацыі.

Такая неузгодненасьць у рабоце адбіваецца на рамонтнай кампаніі МТС, праводзячы рамонтныя работы ня ведаюць, дзе, хто і наколькі мае патрэбу ў рамонце. Гэта прыняло да таго, што рамонтная кампанія зацягваецца. На сёньняшні дзень ні адна МТС не дасягнула 25 проц. выкананьня рамонту. Ёсьць і такія МТС, якія зусім ня прыступілі да рамонту (СТАРЫЯ ДАРОГІ, ЛЕЗНА). Такім чынам, ствараецца рэальная пагроза, што тэрміны рамонту, устаноўленыя ЦК КП(б)Б, будуць упушчаны.

Невыстарчальная работа ў галіне збору сродкаў на трактары, невыкананьне плянаў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру — лепшы довад недаацэнкі значэньня МТС. Ганебнейшы факт. Ні ў адным раёне не рэалізаваны акцыі Трактарацэнтру поўнасьцю. Большасьць раёнаў ня ўключыла рэалізацыі акцый у раённы плян мабілізацыі сродкаў.

Ясныя адносіны да МТС, слабасьць работы па заключэньні дагавораў, дрэнная падрыхтоўка кадраў для МТС, забыцьцё пра масаву работу—па сутнасьці ўсё гэта зьяўляецца сваласьлівай праявай апартуністычных тэндэнцый да работы МТС.

Больш бальшавіцкай самакрытыкі

Задачы МТС у надыходзячай другой калгаснай вясьне на-бальшавіцку вырашаліся нарадай дырэктароў і старшых аграномаў МТС.

Разам з гэтым нельга не адзначыць аднаго з недахопаў у рабоце нарады. Над агонь бальшавіцкай крытыкі браліся цэнтральныя ўстановы, раённыя арганізацыі, але вось бальшавіцкай самакрытыкі было мала. Наглядалася тэндэнцыя ўвальваньня прычын усіх недахопаў і праяваў у рабоце МТС на раённыя арганізацыі і г. д. Але вось, ні адзін з дырэктароў (за выключэньнем дырэктара Лепельскага МТС) самакрытычна не падыходзіў да сваіх недахопаў. Між тым, ёсьць такія факты, якія сьведчаць аб тым, што нашы дырэктары не пасьпешна прымалі ўсе магчымыя захады, каб папрадхіць той ці іншы прагул.

Хто-ж вінават у тым, што ў Лёзьне 5 трактараў стаялі пад сьнегам? Безумоўна, што вінаватыя станцыі.

Многія дырэктары лічылі лішнім дабівацца да канца выраўнаньня справы. Такая пастаноўка пытаньня кідуць на парта.

Толькі ажыцьцяўленьне адзінаначальля ў МТС і належнае кіраўніцтва з боку дырэктараў станцый пры падтрыманьні іх раённымі арганізацыямі і пры шырокім удзеле ў рабоце МТС калгасных мас будзе забясьпечана выкананьне задач, што стаяць перад МТС, як асноўных вагароў сацыяльнае калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы.

І. ЛЯЎКОВІЧ.

Руйнуючы ўдар ПА АПАРТУНІСТАХ, ЯКІЯ ПРАБУЮЦЬ СКАРАЦІЦЬ ПЛЯНЫ ПАШЫРЭНЬНЯ ПЛОШЧЫ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

Бягучы год павінен вызначыць годам рэвалюцыйнага пералому ў спэцыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР. Ад посьпеху пасеўнай кампаніі гэтага году будзе залежыць выкананьне пяцігодкі па тэхнічных культурах.

Паводле пляну Наркамзему ў бягучым годзе па БССР пад лён павінна быць засеяна 240 тыс. гэкт., пад канопляі—40 тыс. гэкт., супроць 127 тыс. гэкт. ільну і 21 тыс. канапель у мінулым годзе.

Рад цэнтральных і раённых установ значына аднесьліся да гэтай важнейшай справы.

Пляны, якія былі выпрацаваны ў лістападзе, усё яшчэ вандруюць па розных інстанцыях. У выніку на сёньняшні дзень раёны атрымалі толькі частковыя пляны сяўбы. Агульны плян ільнаводства да райёна яшчэ не даведзен.

Адсутнічаюць усякія весткі аб ходзе давядзеньня раённых плянаў да калгасаў і да адноасобных гаспадарак. Неабходная масава - растлумачальная работа вакол абмеркаваньня гэтых плянаў сваячасова ня была разгорнута.

Многія раённыя працаўнікі праявілі апартуністычныя адносіны да пашырэньня пасеваў тэхнічных культур. Без усякай прапрацоўкі і абгавареньня кантрольных лічбаў Наркамзему рад раённых арганізацый пачалі слаць тэлеграмы аб немагчымасьці павялічэньня плошчы пасеўных культур, аб тым, што шчы «нерэальны» і г. д. Толькі пасьля паўторнай катэгарычнай дырэктывы гэтых раённых арганізацый згадзіліся в плянамі Наркамзему.

Усё-ж трэба адзначыць, што на пытаньні разьвіцьця ільнаводства да гэтага часу не зварачаюць належнай увагі ні цэнтральныя ўстановы, ні нават Наркамзем.

Так, з 37 саўгасаў, якія ёсьць у ільнаводных раёнах, толькі 2 спэцыялізаваны пад лён. Такі-ж малюнак і з калгасамі. У ільнаводных раёнах мы бачым калгасы любога напрамку, толькі не ільнаводныя. Уворным прыкладам можа служыць сямы ільнаводны раён —Лёзьненскі.

З 25 калгасаў раёну—4 сьвінагадоўчыя, 4—малочна-жывёлагадоўчыя і 17—ільнаводных. Здавалася-б, што ўсё ў парадку, але, на жаль, гэтыя 8 неільнаводных калгасаў—самыя буйныя і моцныя і займаюць 40 проц. усёй калгаснай пасеўной плошчы раёну.

Калі ў Лёзьненскім раёне ўсё-ж 60 проц. калгаснай плошчы ахоплена пасевамі ільну, дык у іншых раёнах гэты процант значна ніжэйшы.

Пытаньне забясьпечэньня пасеваў ільну неабходных пасеньнем зьяўляецца зараз асноўным—у падрыхтоўцы да веснавой пасеўной кампаніі.

На сёньняшні дзень становішча з падрыхтоўкай патрэбнага насеньня вельмі незадавальняючае.

Паводле пляну сёлета неабходна было завезьці 4 тыс. тон насеньняільну з РОФСР. Зараз ужо канчаткова высьветлена, што БССР атрымае ўсяго паўтары тысячы тон насеньня.

Выкананьне праграмы сяўбы тэхнічных культур будзе залежыць выключна ад таго, як будуць выкананы загатоўкі насеньня ільну ў БССР.

На сёньняшні дзень загатоўкі насеньня праходзяць значына марудна. У мінулыя гады ў студзені загатоўкі заўсёды ўжо былі скончаны. Сёлета яны толькі разгортваюцца.

Загатоўчыя арганізацыі зусім не займаюцца адборам насеньня для пасеву. Спажывецкая каапэрацыя, напрыклад, усё загатоўленае насеньне ільну пасылае на заводы для пераапрацоўкі на алей. Абследваньне БАБРУЙСКАГА заводу паказала, што з 54 тыс. пудоў насеньня ільну 24 тыс. пудоў прыгодны, як пасеўны матар'ял. Акрамя гэтага яшчэ 15 тыс. пудоў насеньня ільну мажа быць скарыстана, як пасеўны матар'ял, пасьля адпаведнай ачысткі. Зараз дана распараджэньне аб тэрміновай праверцы ўсіх запасаў ільнасемя на заводах з тым, каб усё семя, якое годна для сяўбы, было забраніравана.

Перад раённымі арганізацыямі стаіць важнейшая задача—дабіцца поўнага выкананьня плянаў загатовак насеньня ільну. Ад гэтага ў першую чаргу будзе залежыць пасьпяховае выкананьне пасеваў тэхнічных культур.

Ня лепш праходзіць арганізацыя першапачатковых вытворчых ільнаводных таварыстваў. Паводле дырэктыў партыі і ўраду да вясны ў ільнаводныя таварыствы павінна быць каапэравана каля 85 проц. адноасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у ільнаводных раёнах. На сёньняшні дзень каапэравана толькі 20 проц., прычым у сапраўднасьці гэта лічба яшчэ меншая. Справа ў тым, што ўсе машыніны і мэханічныя таварыствы мэханічна перайшлі ў ільнаводныя, але без адпаведнай прапрацоўкі статуту.

Слаба таксама пастаўлена абслугоўваньне ільнаводных гаспадарак патрэбнымі спэцыялістамі. У большасьці раёнаў няма спэцыялістаў-ільнаводаў.

Усе гэтыя недахопы павінны быць тэрмінова вынішчаны. Перад ільнаводнымі раёнамі стаіць задача—усю сваю работу пераключыць на выкананьне заданьня па сацыялістычнай рэканструкцыі і спэцыялізацыі свайго раёну.

Па ўсякіх апартуністычных спробах скараціць вызначаныя партыяй і ўрадам пляны пашырэньня пасеўнай плошчы тэхнічных культур—руйнуючы удар.

А.

Ударнікі калгаснага руху— НА ДАПАМОГУ АДСТАЮЧЫМ РАЁНАМ ЛЕПШЫ ВОПЫТ КАЛГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ ПЕРАДАМО УСІМ КАЛГАСАМ БССР

Праўленьне Белкалгасцэнтру прыняло пастанову аб арганізацыі брыгад калгаснікаў для дапамогі слабым калгасам і раёнам у рабоце па разгортваньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі і арганізацыі прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Белкалгасцэнтр, на аснове вопыту іншых рэспублік і вынікаў пасылкі брыгады калгаснікаў арцелі імя Войкава і імя 12 партызан у Глускі раён, прапануе ўсім райкалгассаюзам шырока практыкаваць мэтад прыцягненьня лепшых калгаснікаў для дапамогі ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і па арганізацыі прыліву ў калгасы.

Брыгады вылучаюцца добразахвотна самімі калгасамі са складу лепшых арганізатараў, гаспадаркі, ударнікаў і перадавых калгаснікаў. Брыгадзіры павінны атрымаць падрабязную інструкцыю ад райкалгассаюзаў аб задачах і мэтодах даручанай ім работы.

У першую чаргу масавая пасадка лепшых калгаснікаў-ударнікаў арганізуецца ў адстаючых па калектывізацыі раёны — ВЕТРЫНСКІ, ЗАСЛАЎСКІ, МЕЖАНСКІ, СЕНЬНЕНСКІ, ЦЕРАХАЎСКІ і ЧАВУСКІ.

Усім райкалгассаюзам памянёных раёнаў прапануецца аказваць брыгадам належную дапамогу, мабілізуючы ўвагу ўсіх калгаснікаў вакол мерапрыемстваў, якія праводзяцца брыгадай.

Калгасцэнтрам вылучаны наступныя калгасы, з якіх будуць арганізаваны брыгады: «РАСЬСЬВЕТ-ПЕРАМОЖЦА» (Жлобінскі раён), КАМУНА «ПРАЦА» (Каралінскі раён), «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» і «ЗЬВЯЗДА» (Койданаўскі раён), КАМУНА «ЗЬВЯЗДА» (Пухавіцкі раён), калгасы ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА і «ПРАМЕНЬ СОНЦА» (Лагойскі раён), КАМУНА «БАЛЬШАВІК» (Самахвалавіцкі раён), «ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ» (Астрашыцка-Гарадзецкі раён) і АРЦЕЛЬ «1-га МАЯ» (Самахвалавіцкі раён).

29 студзеня калгаснікі, вылучаныя ў брыгады, павінны зьявіцца ў Менск для інструктаваньня.

ВОПЫТ ЛЕПШАЙ

Гэта МТС — першая на Беларусі на часе стварэньня. Месяц яе нараджэньня — люты 1930 г.

Першыя дні яе існаваньня супалі з пярэлядам вялізарнейшага прыліву (і потым—адпліву...) у калгасы. Гэта быў час «полевекружения от успехов».

І вось імённа тады выявілася вялізарная роля машына-трактарнай станцыі ў справе замацаваньня калгасаў.

Заявы на трактарах

Шмат якія гаспадаркі заяўлялі аб выхадзе з калектыву. Але на палі, руйнуючы межы, разбураючы векавечныя тракцыі, рушылі трактарныя калёны... І ўчарашнія «пехацімцы» (Негарэльскі, Станкаўскі сельсаветы) тут-жа, на трактарах, пісалі заявы аб прыняцьці іх зноў у калгас.

На ўзораныя машынамі палеткі ўсе, як адзін, маналітная сям'я, назаўтра ішлі працаваць новыя калгаснікі!

З тае пары МТС заўсёды злучае ў сабе магутны працоўны фактар і красамоўнага агітатара за сацыялістычныя формы зямлякарыстаньня.

„Сацыялістычны агітпроп“

Пасьля сканчэньня асеньняй сяўбы ў раёне было 32 калгасы. Цяпер мы маем 62 калгасы, або 30 проц калектывізаваных усіх двароў Койданаўшчыны.

У часе правядзеньня дагаворнае кампаніі адноасобнікі ішлі ў калгасы адразу-ж, на сходах. Такім чынам, хваля калгаснага прыбою ўзьняла на сваім грэбні 254 гаспадаркі за апошнія месяц-паўтара.

Пакуль што МТС складзены 27 дагавораў з калгасамі. Вакол гэтай важнейшай кампаніі на мясцох закіпела заўзятая клясавая барацьба.

Кулакі сталі распаўсюджваць іншыя чуткі, пужаць калгаснікаў:

— Калі пачнуць працаваць МТС — вам прыдзецца сесьці на паёк... Хлеб адбіраць будуць!

Растуць кадры

Такая-ж актыўная агітацыя клясавага ворага ішла і пры наборы шэфу рулявых.

— Год працы каля старна на 5 год скарачае жыцьцё чалавека. Ня ідзеце на вудачку!—Шыпелі кулакі і падкулачнікі.

Ня гледзячы на варожую ману, зараз пры Койданаўскай МТС з посьпехам функцыянуюць курсы мэханікаў і старшых рулявых. Курсы рыхтуюць 48 старшых рулявых і 16 мэханікаў ня толькі «для сябе», але і для іншых МТС Савецкай Беларусі. У лютым МТС адкрывае курсы трактарыстаў на 200 асоб. З гэтага ліку мяркуецца мець ня менш 50 проц. жанчын.

Так выкоўваюцца кадры.

У галаве калёны!

Мажліва таму, што Койданаўская МТ

ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ—НА СЛУЖБУ ЗАДАЧАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ

Узмацненьнем парткіраўніцтва, барацьбой з апартуністычнай практыкай, хуткай арганізацыйнай перабудовай— забясьпечым карэннае паляпшэньне работы спажывецкай каапэрацыі, узьнімем яе баяздольнасьць

Першачарговае забесьпячэньне ўдарнікаў—

магутны сродак росту прадук цыйнасьці працы

У бальшавіцкай барацьбе за прамфінплян, за высокія тэмпы сацыялістычнага наступленьня, адно з галоўных месц займае новая форма сацыялістычнай арганізацыі працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Каля двух мільёнаў рабочых-ударнікаў зьяўляюцца важнейшым фактарам разьвіцьця сацыялістычнае прамысловасьці.

Партыя лічыць неабходным заахвочваньне і стымуляваньне ўдарніцтва, прэміяваньне лепшых і ўцягненьне ва ўдарныя брыгады новых сотень тысяч рабочых.

Апошні пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) на аснове пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) даў рад дырэктыў, якія забясьпечваюць у будучым годзе паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

Адсюль — выключная адказнасьць, якая ўскладаецца на органы забесьпячэньня і на спажывецкую каапэрацыю за правільную арганізацыю рабочага забесьпячэньня, за мясавае разьмеркаваньне, як фактар, спрыяючы лепшай арганізацыі вытворчасьці, павышэньню прадукцыйнасьці працы і ўзмацненьню працоўнай дысцыпліны.

Прайшоў месяц з часу скапленьня пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), а беларуская каапэрацыя і органы забесьпячэньня пакуль што яшчэ ня прынялі належных мер для вылучэньня спэцыяльных фондаў на прэміяваньне ўдарнікаў. Нават фонды па прэміяваньню ўдарнікаў-транспартнікаў і будаўнікоў, якія былі вызначаны ва ўдарным квартале, да гэтага часу ня ўсе разьмеркаваны. Сам Белкаапсаюз ня ведае, як праходзіла разьмеркаваньне адпушчаных тавараў.

Справа забесьпячэньня ўдарнікаў у першую чаргу, стварэньне спэцыяльных фондаў для прэміяваньня ўдарнікаў — не знайшлі належнага месца ў рабоце спажывецкай каапэрацыі і органаў Наркамснабу.

Матар'яльная база, што падводзіцца пад ударніцтва, чулыя адносіны да ўдарнікаў з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці і пазбаўленьне лятуна, прагульшчыка на час права карыстаньня вышэйшай катэгорыяй — гэтыя мерапрыемствы павінны спрыяць узьняцьцю і ўзмацненьню працоўнай дысцыпліны і павялічэньню эфэктыўнасьці працы рабочых.

Побач з прадастаўленьнем пераваг ударнікам па забесьпячэньні востра дэфіцытнымі таварамі (вылучэньне спэцыяльных фондаў тавараў) неабходна паставіць пытаньне аб вылучэньні спэцыяльных фондаў для лепшых ударных прадпрыемстваў.

Закрытыя разьмеркавальнікі прадпрыемстваў, якія сыстэматычна выконваюць прамфінплян, павінны забясьпечвацца ў першую чаргу лепшымі і ў большай колькасьці дэфіцытнымі таварамі.

Наркамснаб і Белкаапсаюз павінны ў бліжэйшыя дні зрабіць вылучэньне гэтых фондаў з тым, каб у першых лічбах лютага гэтыя фонды паступілі для разьмеркаваньня паміж ударнікамі.

ПЛЯН МЯСАЗАГАТОВАК ВЫКАНАЦЬ У ТЭРМІН

Спагнаць мяса па цьвёрдых заданьнях з кулакоў

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) высунуў баявую задачу ў галіне хутчэйшага вырашэньня мясной праблемы і наладжваньня справы мясазабесьпячэньня. Пленум частаніў да 1 красавіка выканаць ня менш 70 проц. гадавога заданьня па загатоўках жывёлы. Для выкананьня гэтай задачы мясцовыя загатоўчыя, партыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны неадкладна перабудаваць сваю загатоўчую работу на новы лад, пераводзячы яе на хуткія тэмпы.

Між тым, ход мясазагатовак за асобны квартал і першую дэкаду студзеня г. г. паказвае, як далёка яшчэ нашы загатоўчыя арганізацыі ад патрэбных для выкананьня гэтай дырэктывы партыі тэмпаў. Так, за асобны квартал па ўсёй рэспубліцы заданьне выканана ўсяго на 42 проц., а за першую дэкаду студзеня выканана ўсяго 9,2 проц. месячнага заданьня. Прычыны такога недапушчальна павольнага выкананьня пляну мясазагатовак можна вытлумачыць наступным: замест таго, каб давесьці плян загатовак да сяла, даць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнай частцы яшчэ 10 сьнежня 1930 г., большасьць раёнаў дала заданьне сельсаветам толькі 5-га, 10-га і 15-га студзеня. Сельсаветы-ж пачалі даваць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможнай частцы значна пазьней і ня ўсім рапуча. Мы маем цэлы рад паведамленьняў аб тым, што ў некаторых раёнах прабуюць зьмякчыць мэтад дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам пры дапамозе рознага роду агаворак і паправак да ўсім выразнай дырэктывы партыі. Так, Мазырскі РВК давёў плян у штуках жывёлы, чым даў повад да зьмяншэньня пляну загатовак і выкананьня яго выключна маладняком; Тураўскі РВК дачу цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам даручыў, замест сельсавету, камісіі сацзейнасьці; Койданаўскі РВК пад выглядам выбораженьня прадукцыйнай жывёлы для камплектаваньня стада замест выкананьня заданьня па кулацка-заможнай частцы да 15 лютага кантрактуе ў апошній жывёлу. Многія раёны зьбіраюцца выканаць пляны старым прасольскім мэтадам на рынках; некаторыя РВК прабавалі зьмяншаць даныя ім пляны (Пухавіцкі і Лёзьненскі РВК).

Ня гледзячы на такі доўгі тэрмін, што мінуў з часу даны дырэктыў аб новых мэтадах загатовак жывёлы, загатоўчыя арганізацыі да гэтага дня яшчэ не перабудавалі сваёй работы і ня могуць канчаткова адмовіцца ад прасольскіх мэтадаў. Тыя арганізацыі, якія зьняты з загатовак, не нераладзяць свой апарат адзінай загатоўчай сыстэме, што застацца ў рабіе. Ёсьць выпадкі несвая часовага перакідваньня грошай і прамтавараў для здачы жывёлы. Слаба прыцягнута да такога важнага пытаньня, якое адыгрывае першачарговую ролю ў рабочым забесьпячэньні, грамадзкая ўвага партыйных, савецкіх, прафсаюзных арганізацый, калгасьнікаў і бядняцка-сярэдняцкай часткі вёскі.

Для таго, каб перабудаваць загатоўкі на патрэбныя тэмпы і тым самым наладзіць забесьпячэньне пралетарскіх цэнтраў мясам, трэба перш за ўсё ўдарыць па ўсіх апартуністычных спробах сказіць важнейшыя дырэктывы партыі, і ўзяцца за работу па-бальшавіцку. Трэба разгарнуць масавую работу вакол гэтага пытаньня, бо кулацка-заможная частка вёскі стараецца здаваць па цьвёрдых заданьнях жывёлу, нягодную ні для камплектаваньня стада, ні па мяса (нягодны маладняк, парасяты, худыя, малой вагі авечкі з ягнятамі). У гэтымжа кірунку вядзецца таксама кулацкая агітацыя і сярод сярэдняцкай часткі вёскі. З гэтым зьявішчам трэба весьці рашучую барацьбу. Ад кулацка-заможнай часткі неабходна атрымаць годную для камплектаваньня стада і мяса жывёлу. Што датычыць бядняцка-сярэдняцкай часткі, дык трэба растаўмачыць ёй ня выгаднасьць здачы маладняка, суяных авечак.

Асноўная прадпасылка посьпеху загатоўчай кампаніі жывёлы — гота перапясьнёна ў яе тых мэтадаў загатоўчай работы, якія апраўдалі сябе на больш важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі збожжазагатовак. «Сымела перанесьці ў практыку мясазагатоўчай работы выпрабаваныя мэтады збожжазагатовак», — так гаворыць рэзалюцыя сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Неабходна пераглядзець увесь загатоўчы апарат і найголае замяніць носьбітамі пралетарскімі кадрамі.

Немалаважнае значэньне мае доглядж жывёлы ад моманту яе загатоўкі да моманту перадачы яе спэцсэктару ці забою. У гэтых адносінах у многіх мясцох яшчэ назіраецца шмат агідных.

Згуртаваўшы сілы парыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый на гэтым важнейшым вучастку, мабілізуючы пралетарскую грамадзкасьць вакол усіх гэтых пытаньняў, часткоўшы пад пільны кантроль увесь ход загатоўчай кампаніі, пераводзячы сапраўды на рэйкі ўдарніцтва ўсю загатоўчую работу, мы дабіцемся 100-проц. выкананьня пляну загатовак жывёлы, які забясьпечыць выкананьне заданьняў партыі як па кам плектаваньні стада, так і ў галіне мясазабесьпячэньня.

І. К.

„Што дадуць, тое і еш“

СЛУЦАК, 27. (Па тэлефону). Слуцкая сталоўка № 2 прызначана абслугоўваць выключна рабочых слуцкіх прадпрыемстваў.

Са сваімі абавязкамі сталоўка не спраўляецца. Якасьць абедаў вельмі дрэнная. Тлушчы ў большасьці адсутнічаюць.

Абеды пачынаюцца заўсёды з вялікім спазьненьнем. У выніку рабочыя не пасьпяваюць за час перапынку паабедаць.

Адносіны афіцыянтак да рабочых грубыя. Калі рабочы спытае — што даюць на абед, чуецца крыклівы адказ:

— Ня ведаю. Што дадуць, дык тое і еш. Ідзеце к чарту.

Загадчыка сталоўкі ніколі ня зловіш. Ён недзе займаецца «сваімі справамі». Сталоўка яго зусім ня цікавіць.

Намяшканьне падобна на нейкі барак. На сталох кучы бруду. Іх ніхто не выцірае.

Рабочыя Слуцку абураны такой пастаноўкай справы грамадзкага харчаваньня.

Неадкладна паставіць работу рабочай сталоўкі на належную вышыню — баявая задача партыйных і прафсаюзных органаў.

ПАЎЛОЎСКІ.

„Без дазволу Менску--ня маем права“

ВОРША, 25. (Па тэлефону). Аршанскі мясны камбінат знаходзіцца ў 5 клм. ад гораду.

Рабочыя і служачыя камбінату ня маюць ніякай магчымасьці атрымаць у тэрмін свой паёк у каапэрацыі. Прамтаварамі рабочыя не забясьпечваюцца.

На шматлікія просьбы рабочага калектыву адкрыць разьмеркавальнік Аршанскі ЦРК бюракратычна адказвае:

— Без дазволу Менску зрабіць гэта мы ня маем права.

Галавацяны з аршанскага ЦРК сьядома зьдзекуюцца над выдзекуванымі партыі па пытаньні паляпшэньня і лепшай арганізацыі справы рабочага забесьпячэньня.

Голасу 400 рабочых ніхто ня чуе.

Аршанскі гарком партыі павінен рашуча ўдарыць па галавацяпах ЦРК.

Ідэльчык.

Скарыстайце вопыт „Камунара“

У сталоўцы ўжо няма штурхатні. Рабочыя ня кідаюць работы раней гудка. Яны ня ідуць у фабзаўком і ў парткалектыў са скаргамі на неналадкі ў сталоўцы. Рабочаму ня прыходзіцца пенякоіцца за тое, што ён не атрымае абеду. Ён зараз упэўнены, што з-за абеду ня спозьніцца на работу. Нарэшце, рабочы мае магчымасьць у абедзены перапынак адпачыць і пачытаць газэту. Заводзкія арганізацыі могуць у абедзены перапынак правесьці культурна-выхаваўчую работу.

А колькі клопату было ў «трыкутніку» заводу аб рабоце сталоўкі. Колькі раз прыходзілася гаварыць на пасяджэньнях бюро партсталоўку аддае свой талён дзі журнаму. Другі дзяжурны расс дзіваe па 10 чал. за сталом, якім ужо расстаўлены талеркі, хл і бачкі з супам на 5 чал. У ч яды першае стравы, афіцыянт нясуць другую страву. Такім ч нам, абед працягваецца 10-12 хв лін і абслугоўваючы пэрсанал м магчымасьць падмесьці памяш каньне сталоўкі і падрыхтаваць да наступнае зьмены. Таксама а слугоўваюцца другая і трэцяя зы ны.

Трэба адзначыць, што раней б ло 16 афіцыянтак і яны не спра лліся з падачай абедаў; пры н вым мэтадзе працуюць 13 афіц

Сталоўка заводу «Камунар»

калектыву і фабзаўкому аб сталоўцы?

Выхад быў знойдзен. Загадчык ст лоўкі рабочы-вылучэнец тав. Сокалаў быў камандыраваны ў Маскву на завод «Электропровод» з мэтай вывучэньня вопыту работы сталоўкі і перанясьненьня яго на завод.

Некалькі дзён падрыхтоўкі і перайшлі па мэтад работы сталовых «Элэктропровода».

Са сталоўкі былі выкінуты даўгія сталы і лаўкі. Устаноўлены сталы па 10 чал. Замест доўгіх лавак закупілі ўслонцы і калі адзін раней скончыць абедаць, яму ня прыходзіцца трывожыць сваіх таварышоў пры ўставаньні са свайго месца.

На заводзе ўстаноўлена 5 зьмен па групах у 150 - 170 чал. абедаючых з разьлікам 35 хвіл. на кожную зьмену.

Парадак абедаў устаноўлен паяптак і спраўляюцца з работа Якасьць абедаў значна палепш лася.

Заканчваецца пабудова сьвіна ніка пры заводзе на 50 сьвіней.

У канцы лета будзе гатова ст ловая, якая будуецца ў нов корпусе.

Траба адзначыць, што рабо буфэту пастаўлена яшчэ ня зус добра. Чэргі ў буфэце яшчэ н вжыты.

Фабрычныя арганізацыі заво «Камунар» шмат прапрацавалі, к палепшыць работу сталоўкі. І шым заводам і фабрыкам ёсьць ч му навучыцца.

Трэба арганізаваць пасыл брыгад у сталоўку заводу «Кам нар», каб гэты вопыт шырока в карысталі ўсе заводы і фабры БССР.

На «Камунары» ў сапраўдна ці сталоўка — цэх заводу.

Р—н.

У сталовых хаос, неразьбярыха...

БАРЫСАЎ, 27. (Па тэлефону). Справа грамадзкага харчаваньня ў Барысаве пастаўлена надзвычай дрэнна.

Прафсаюзныя, партыйныя і інш. арганізацыі пытаньнямі паляпшэньня грамадзкага харчаваньня не займаюцца.

У сталоўках брудна. Няма ніякага парадку. Якасьць абедаў самая найгоршая.

У сталовых панае хаос, неразьбярыха. Крык, шум і лаянка перапаўняюць сталовыя. У некаторых з іх творацца злачынствы.

Абслугоўваючы персанал у рабочай сталоўцы № 3 пры гуце «Дамбаль» проста зьдзекуецца над сваімі наведвальнікамі.

У чаканьні, пакуль падалуць абед, рабочыя праседжваюць за сталамі на 30-40 хвілін.

Ёсьць факты, калі адной частцы рабочых даюць добрае мяса, а другой — катлеты на палову з мукой, або крупамі.

Загадчык сталоўкі загадвае, каб яму смажылі бульбу ў масьле, інакш ён будзе прыцягваць новара да адказнасьці. Работнікі сталовай ядуць, што ім хочацца, абдурваючы рабочага спажыўца.

В.

Ідэя сустрэчнага гандальфінпляну

загразла ў нэтрах канцылярый ЦСПСБ і МЦРК

У СЬНЕЖНІ МЕСЯЦЫ РАБОЧЫЯ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ ВЫКЛІКАЛІ НА САЦСПАБОРНІЦТВА БУЙНЫЯ МЕНСКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ НА ПРАВЕРКУ І СКЛАДАНЬНЕ СУСТРЭЧНАГА КААПЭРАЦЫЙНАГА ГАНДАЛЬФІНПЛЯНУ.

НА ВЫКЛІК АБУТНІКАЎ АРГАНІЗАЦЫІ ЗАВОДАЎ НЕ АДКАЗВАЛІ. СПІНІЛАСЯ РАБОТА І Ў АБУТНІКАЎ.

ЦЕПОЕ НЕ ПАДХОПІЛЕН ДОБРЫ І ЦІКАВЫ ПАЧЫН РАБОЧЫХ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ. НІ АДЗІН КУЛЬТМАСАВЫ СЭКТАР ЦІ ПРАФСАЮЗАЎ ТАКСАМА НЕ ПАЦІКАВІЎСЯ ЗАНЯЦЦА ГЭТАЙ СПРАВАЙ.

ЗАРАДЧЫК КУЛЬТМАСАВЫМ СЭКТАРАМ САЮЗУ МЭТАЛІСТАЎ — ТАВ. СУЛІЖЫН НАВОГУЛ НЯ ВЕДАЕ ЧЫМ МОГУЦЬ ДАПАМАГЧЫ РАБОЧЫЯ І ПРАФСАЮЗЫ Ў СКЛАДАНЬНІ СУСТРЭЧНЫХ ГАНДЛЬФІНПЛЯНАЎ. (?!)

САМО ПРАЎЛЕНЬНЕ МЕНСКАГА ЦРК ПА СЬНЕШНІ ДЗЕНЬ НІ АДНАМУ ЦІ САЮЗУ СВАЙГО ГАНДЛЬФІНПЛЯНУ НЯ ПРЫСЛАЛА.

НА ПЫТАНЬНЕ — ЯК ДАВЕДЗЕН ГАНДЛЬФІНПЛЯН ДА КОЖНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА, СТАРШЫНЯ ПРАЎЛЕНЬНЯ МЦРК — ТАВ. КУМКЕО АДКАЗАЎ:

— МЫ ЎЖО ПРАВЯЛІ СХОДЫ РАБОЧЫХ НА ЗАВОДЗЕ «БАЛЬШАВІК». У ДРУКАРНІ ІМЯ СТАЛІНА, У ЧЫГУНАЧНІКАЎ. НА ГЭТЫХ СХОДАХ СТАВІЛІСЯ ПЫТАНЬНІ АБ ГАНДЛЬФІНПЛЯНЕ, РАБОЧЫЯ ВЫСОЎНУЛІ СВАЕ СУСТРЭЧНЫЯ ПЛЯНЫ.

ГЭТА ВАЖНЕЙШАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА ВЕЛЬМІ МАРУД НА. МАСЫ РАБОЧЫХ АБ ІМ НІЧОГА НЯ ВЕДАЮЦЬ.

А. М.

У бабруйскіх разьмеркавальніках беспарадак

БАБРУЙСК, 27. (Па тэлефону). У гор. Бабруйску працуе 5 закрытых рабочых разьмеркавальнікаў. Пастаноўка іх работы зусім не адпавядае даным дырэктывам партыі.

Цесната, беспарадак, чэргі — усё гэта ні выжыла з разьмеркавальнікаў. Прынцып забесьпячэньня закрытых разьмеркавальнікаў лепшымі таварамі не захоўваецца.

Закрыты разьмеркавальнік № 1 абслугоўвае 4 тыс. рабочых дрэвапрацоўчага камбінату. Разьмеркавальнік аб'ядноае дзьве крамы і 6 паркоў. Памяшканьні гэтых крам і паркоў нікуды не адпавядаюць. Яны хутчэй падобны на вартаўчыя будкі.

СЫСТЭМА І ТЭХНІКА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ТАВАРАЎ НЕ ПАЛЕПШЫЛАСЯ. ВУЧОТУ ПРЫМАЦАВАНЫХ ДА КРАМ НЯМА. РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ НЕ ПРАВЕДЗЕНА. ЧЭРГІ РАСТУЦЬ, АСАБЛІВА Ў ГАЛЯНТАРЭЙНЫМ АДДЗЯЛЕНЬНІ. ЗАГАДЧЫК КРАМЫ ЗАЎСЕДЫ АДСУТНІЧАЕ.

Грамадзкая думка вакол работы разьмеркавальнікаў ня створана. РАБОЧЫ КАНТРОЛЬ НАД РАБОТАЙ РАЗЬМЕРКАВАЛЬНІКАЎ АДСУТНІЧАЕ.

Райпрафсавет і райком партыі павінны праверыць работу разьмеркавальнікаў і зрабіць адпаведныя вывады.

Работа бабруйскіх рабочых разьмеркавальнікаў павінна быць безадкладна перабудавана ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі.

А. МАГІДАЎ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на люты і далейшыя м-цы 1931 г. на газ. „ЗЬВЯЗДА“

З 1-І—31 г. газэта ВЫХОДЗІЦЬ БЕСЬПЕРАПЫНКА

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА на 1 месяц —1 руб.

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Новая хваля белага тэрору ў фашысцкай Польшчы

Каты Пілсудзкага зьбіваюць і катуюць палітзьняволеных

Польскі фашызм перайшоў да тэнэральнай атакі на рэвалюцыйных палітзьняволеных. Не пасьпелі яшчэ асьтынуць вогнішчы украінскіх хат пасьля «пацыфікацыі», за якую жыцьцём заплацілі многія сыны працоўных мас Зах. Украіны, як у кастрычніку 1930 г. агінулі ад куль і штыхоў фашысцкіх карных экспедыцый на Зах. Украіне сялянс: Васіль Пращчаньскі, Іван Варэніца, Фёдар Чайноўскі, Марвій Паранка, Дзьмітро, Підгірны, Васіль Шуль, Міхайла Пятрушка, Міхайла Тутко і вучань Міхайла Баднар. Яшчэ не зарубцаваліся раны кандыдатаў у дэпутаты антыфашысцкіх партый, упаўнаважаных і членаў выбарчых камітэтаў, якія былі арыштаваны да выбараў, зьбіты да страты прытомнасьці, і ад якіх патрабавалі... пераходу ў Б. Б. (фашысцкая ўрадавая партыя). Так, напрыклад, зьбіт у Красьнавіцах (Кутнеўскі павет) тав. Блоньскі і рад іншых. Тое-ж самае мела месца ў Вацлаўскай, Седлецкай, Верхня-Сілескай акругах і інш. Не на адной вясковай дарозе, ня толькі на Зах. Украіне і Зах. Беларусі, але і ў карэннай Польшчы (напрыклад, у Конінскай акрузе) па сёнешні дзень пташкі харчуюцца зтаптаным паліцыяй у балота зернем з сялянскіх сьвірнаў, уласьніці якіх фігуравалі кандыдатамі ў антыфашысцкіх сьпісах.

Пасьля асеньняга працэсу 64 сялян і рабочых у Ковелі, пасьля масавага працэсу легальнай ППС ляўіцы ў апэляцыйным судзе ў Варшаве, які агулам даў палусудным сотні год турмы, адбыўся ў Радоме ў канцы сьнежня 1930 г. працэс больш 10 чалавек, абвінавачаных у прыналежнасьці да КПП, які скончыўся асуджэньнем 9-ці падсудных агулам на 37 год турмы, ад 2 да 7 год кожнага. Буйны масавы працэс легальнага беларускага дэпутацкага клюбу «Змаганьне» (мінулага сойму), кіраўнікоў ліквідаванага ўрадам Таварыства Беларускай Школы і банку беларускіх каапэратываў скончыўся натаржнымі прыгаворамі, прычым антыфашысцкія дэпутаты атрымалі па 8 год катаргі кожны. На Заходняй Украіне падрыхтоўваецца новы масавы працэс у Луцку. Такім чынам, пілсудчына ачышчае глебу ад антыфашысцкіх і варожых польскай акупацыі элемэнтаў, у сувязі з падрыхтоўкай вайны супроць СССР.

Але фашысцкаму ўраду не хапае царскага карнага кодэксу, якім зараз карыстаецца фашысцкая Польшча. Яму патрэбна больш хуткая і бесцэрэмонная расправа з рэвалюцыйным авангардам. Для гэтай мэты (паміма карных экспедыцый) дасканала падыходзіць як знішчаньне ахранкі, дзе арыштаваныя дзьмухаюцца цэлымі тыднямі агентамі палітычнай паліцыі да перасылкі іх у турмы, так і сьледчыя карныя турмы, крэпасьці і катаргі, дзе в гэтай мэтай уводзіцца фашысцкі турэмны рэгламант.

Польская ахранка заваявала сабе заслужаную славу ва ўсім сьвеце, як месца ўтончаных катаваньняў. Факты апошніх некалькі месяцаў неравышваюць у адносінах зьвярэрасьці і садызму ўсё, што адбывалася да гэтага часу. У верасьні, у перадмабарчы пэрыяд арыштавана ў Львове 15 чал. моладзі па падазрэньні ў прыналежнасьці да КПЗУ.

Усе арыштаваныя дзяўчаты былі згвалтаваны шпікамі і адной з іх — Штыфтэр — увялі гарачае жалеза ў палавыя органы, пасьля чаго ўлівалі ёй ваду, потым адправілі яе ў турэмны шпіталь у сыфілітычную палату для замаскаваньня прычын унутранога крывацёку. Але і цяпер не пакінулі яе ў спакоі. Шпікі Кавальскі і Вайцэхоўскі прыходзяць да яе ў шпіталь з пагрозамі: «Калі ты вылежышся, ты нам зноў дастанешся, усё нам раскажаш». Траба адзначыць, што т. Штыфтэр не зламалася. Аднак, гэтыя нечалавечыя катаваньні прывялі яе да вар'яцтва; калі хто небудзь адчыняе дзьверы палаты, тав. Штыфтэр канвульсыйна корчыцца на ложку, пакрываецца коўдрай і жудасна крычыць. У гэтай-жа турме сядзіць згвалтаваная шпікам тав. Тазман. Гэты факт добра ведомы пракуратуры.

Тав. Левіну, Мэндэмо і інш. арыштаваным па гэтай-жа справе ўбівалі пруты дольцэ шпільскі за пазногці, вешалі за вапасы і білі па пятах гарачым жалезам. У перадвыбарчы пэрыяд (у палавіне лістапада) арыштавалі ў радзе украінскіх гарадоў дзесяткі людзей, якія падазраваліся ў рэвалюцыйнай дзейнасьці. Усе яны былі перавезены ў слаўную ахранку ў Луцку (далёка ад прамысловых цэнтраў), дзе пануе выявода Юзэфсні, былы міністар унутраных спраў за ўрадаў Пілсудзкага і былы міністар украінскага ўраду папромічыка Пятлюры, і яго правая рука — ведомы кат украінскіх рабочых і сялян — малодшы камісар паліцыі Зарэмба. Асабліва зьверска катавалі студэнта Шаяна. Другі з арыштаваных Левін быў так страшна зьбіты, што ўсё яго цела прадстаўляла адну акрываўленую масу. У рэзультаце прыпляньняў і пабояў, ногі яго канчаткова разьбіты. З тае прычыны, што пяцчасны ўвесь час быў у непрытомнасьці і жудасна енчыў, яго адвезьлі ў шпіталь. Калі ён крыху прыйшоў да сябе, яго зноў прывезьлі ў ахранку і пачаў началіі яго катаваць. Пасьля некалькіх тыдняў сем'і арыштаваных, нарэшце, атрымалі спатканьні, але ўсе, асабліва т. т. Левін і Шаян, робяць уражаньне сапраўдных вар'ятаў і пры відзе сям'і пачынаюць жудасна крычаць: «Нічога ня ведаю, нічога не скажу».

На працягу 3-х тыдняў зьбівалі і мучылі арыштаваных. У часе «допыту» забілі тав. М. Паўлюка, выдатнага рабочага дзеяча, былога рэдактара «Профсоюзной Жизни» у Пшэмысьлі, а таксама Стэфана Бойка салянскага дзеяча. Тав. Мануелўна пасьля допыту малодшым камісарам Зарэмбай перарвала сабе вены. У Холме (Заходняя Украіна), дзе камісарам паліцыі зьяўляецца правакатар з 1920 г. Выкуш, замучан 29 лістапада 1930 г. тав. Арэнштэйн. Пасьля 5-гадовага знаходжаньня ў ахранках і турмах Холма, Любліна, Ломжы і Дарагабыча памёр у турме 30 верасьня 1930 году 36-гадовы тав. Аляксандар Ясінскі, сакратар ЦК КПЗУ.

У польскіх ахранках на Заходняй Украіне толькі на першы допыт ідуць самі, але варачаюцца ўжо на насілках. У наступныя разы на допыт для новых катаваньняў бяруць і варачаюць іх на насілках.

Фашысцкая ахранцы на Зах. Украіне ня ўступае ў адносінах лютасьці польская ахранка на Заходняй Беларусі. У Берасьці ў часе допыту ў ахранцы згвалцілі і заразілі маладую дзяўчыну, прозьвішча якой будзе вынулена. У Пінску адну з арыштаваных павесьлі ночу на могілкі, разьдзелі і закапалі па шыю ў зямлю, прымушаючы такім спосабам да прызнаньня, пагражаючы закапаць цалкам. У Івацэвічах, у часе допыту арыштаваным улівалі бутылкамі мачу праз нос. Такім чынам заражаны ў Берасьці венэрычнай хваробай кандыдат антыфашысцкага сьпісу стары чыгуначнік. Вось яркія, але далёка ня ўсе факты фашысцкага садызму. Зьявіўшы, які жывым выпаў з гэтага пекла, трапляе ў турму, дзе яго чакае фашысцкі турэмны рэгламант, які ставіць сваёй мэтай маральна паніжыць і фізічна зьнішчыць зьняволеных рэвалюцыянэраў. Турэмны рэгламант клясавай «гостыцы», скасоўвае ўсе правы палітзьняволеных, прыроўнівае іх да крымінальных (супольныя камэры, прымусовае нашэньне турэмнай вопраткі і г. д.), не прызнае права прадстаўніцтва палітзьняволеных (старастаў), ліквідуе на практыцы амаль цалкам бібліятэкі палітзьняволеных і цэнзуруе легальныя газэты, робячы такім чынам з іх нудную манулатуру. Рэгламант скасоўвае існуючую да гэтага часу харчовую камуну; гэта мае на мэце пасеяць варожасьць паміж больш заможнымі та варышамі, галоўным чынам, інтэлігентам, які атрымлівае лепшыя перадачы з дому і паміж рабочымі і сялянмі, якія атрымліваюць горшыя. Для пагыбленьня гэтай варожасьці фашызм уводзіць пэдэвалоньне зьняволеных — адлучае інтэлігэнтаў ад рабочых, рабочых ад сялян, палякаў ад украінцаў, беларусаў, яўрэяў і немцаў, жадаючы гэтым пасеяць узаемную нянавісьць сярод зьняволеных, не дапусьціць іх да міжнароднай салідарнасьці зьняволеных рэвалюцыянэраў, а таксама перашкодзіць выхаваньню менш падрыхтаваных таварышоў старшымі і больш палітычна разьвітымі таварышамі. Фашысцкі рэгламант на ўводзіцца адразу: атакуюць больш слабыя зьвенні в самага слабога боку; у выпадку посьпеху рэгламант праводзяць далей; у выпадку мопнага адпору палітзьняволеных фашызм часам адступае, каб пры першай магчымасьці зноў пачаць атаку (Павяк, Петракоў, Ломжа, Плоцк, Горадня і інш.).

Ва украінскіх турмах рэгламант уведзен не ўсе 100 процантаў. Гэта стварае атмасферу пастаяннай нервовай напружанасьці, якая павосбных, больш слабых таварышоў, даводзіць да вярвовага расстройства і нават да сьмерці.

Ва ўсіх турмах адміністрацыя падбухторвае адну групу палітзьняволеных супроць другой, утаварваючы больш слабыя элемэнты да здрадніцтва, шпіянажу і правакацыі, да падпісваньня ганебных дакумантаў, накіраваных супроць камуны палітзьняволеных і рэвалюцыйнага рабочага руху. Гэтыя дакументы друкуюцца потым у фашысцкай прэсе і некаторыя здраднікі вызваляюцца да суда. Для лепшага ўвядзеньня фашысцкага рэгламанту ўрад мілітарызуе турмы, назначаючы начальнікамі палкоўнікаў (апошні час Равіч, Плоцк). У дадатак часткова ліквідуюцца меншыя турмы (Пешні, Міхоўцы, Тарноўскія Горы ў Верхняй Сілезіі), калі зьняволеныя супярчаць супроць увядзеньня рэгламанту. І рассялаюць самых актыўных з іх на катаргу ў Пазнанскую акругу (Вронкі, Равіч, Грудзядца, Каранова, Фардон). Высылка турэмнага актыву ў пазнанскія турмы становіцца паўсюдным зьявішчам, у сувязі з сыстэмай групоўкі самых турмаў.

У апошні час некалькі сотень украінаў і беларусаў былі перавезены ў Седлецкую турму, дзе знаходзяцца прыгаворэныя да пакараньня сьмерцю камсамольцы, потым у Грудзёндзкую і Петракоўскую турмы. Петракоўская турма зьяўляецца адной з самых цяжкіх — там існуе сыстэма катаваньняў і зьбіваньня, адзяваньня «смирительных» кашуль і абліваньня халоднай вадой палітзьняволеных. Гэта стала прычынай таго, што ўвесну 1930 году адбыліся бурныя дэманстрацыі рабочых ля турмы і рабочыя разьбілі шыбы і разграмілі кватэру турэмнага начальніка. У сувязі з пратестам супроць увядзеньня фашысцкага рэгламанту ў лістападзе 1930 году адбылося зьбіваньне палітзьняволеных у Тарноўскіх Гарах (Верхняя Сілезія), хаця барацьба іх скончылася потым перамогай. 20 кастрычніка зьбіта да крыві 65 зьняволеных у Любліншкай турме (у прысутнасьці пракурора і пры актыўным удзеле начальніка турмы) прычыны пратэсту супроць падвялення зьняволеных па нацыянальнасьці. У рэзультаце гэтых катаваньняў некалькі з іх доўгі час плявала крывёю. Начальнік Павяцкі заявіў, што зьбіваньне не будзе паўторана, калі палітзьняволеныя вадою, зьняволеных зьбілі да страты прытомнасьці, частку вывезьлі. Тут мы ў Вронках і Лодзі зьяўляецца ставанным месцам катаваньняў зьняволеных. У Вронках 1 мая адбылося зьбіваньне зьняволеных пры ўдзеле спэцыяльна прыведзеных паліцэйскіх, якія працягвалася каля 4-х гадзін. Білі кулакамі і настаўкамі па галовах. Незалежна ад гэтага адміністрацыя атрымлівае жыцьцё зьняволеных тысячамі іншых агідных сьцяк. У Фардоне (жаночая турма ў Познаньшчыне) начальнікі канфіскуюць трапоныя дэпэшы зьняволеных жанчын, прымушаючы гэтым іх на галодную сьмерць. У Сорбіі (жаночая турма ў Берлане) адміністрацыя ўжыла модны ня агляд у адносінах да палітзьняволеных, такі агляд робіць толькі ў адносінах да праститутак. Таварышоў, якія ў таму не падпадаюцца, садзяць на цэлы тыдзень ў сырыя сутэрэны. Сотні агітацыяў у турмах робяць у часе падачы ежы зноў у часе спатканьняў, у адносінах да карэспандэнцый і г. д. У турме Павяк у Варшаве у сувязі з пратэстам зьняволеных супроць раздачы ежы каля прыбіральні, зьбіты дэпэс палітзьняволеных так моцна, што сам улада пераслала яго ў турэмны шпіталь у Макатове (Варшава), дзе знаходзіць таксама хворы дэпутат тав. Жарскі.

З прычыны новай атакі польскага фашызму на тыя прывілеі, якія здабыты палітзьняволенымі шляхам шматадзовых упартай барацьбы, палітзьняволеныя і казалі цэлым радам галадовак. Так, палітзьняволеныя ў Бедастоку (Зах. Беларусь) галадалі 10 дзён (верасень), Вільні (у кастрычніку) 7 дзён, у Берсьці — 5 (сьнежань). У Беластоку рабочыя пад кіраўніцтвам кампартыі патрымалі галадоўку палітычнай забастоўкай (прымалі ўдзел 800 рабочых), мітынгамі і дэманстрацыямі. Зьявіліся таксама праклямацыі на гэтым пытаньні. Галадоўка закончылася перамогай. Падобным чынам перамаглі зьняволеныя ў Берасьці. У Вільні, дзе быў арэшт рад тактычных памылак, галадоўка была прайграна. У Тарноўскіх Гарах, Луцку, Ломжы былі даны пераможны адпор у сувязі з радам атак на права рэвалюцыйных палітзьняволеных. Зараз адбываецца галадоўка па Павяку (Варшава), адкуль вывезьлі ўжо рад актыўных таварышоў. У сувязі з гэтай кампаніяй у Варшаве адбылася вялікая дэманстрацыя і рад фабрычных мітынгаў. Згодна апошніх вестак, г

5 і 6 дзень перавыбараў Менгарсавету

ЗА БАЯВЫ ОРГАН пралетарскай дыктатуры!

ПЕРАВЫБАРЫ ПРАХОДЗЯЦЬ ПАД ЗНАКАМ УЗРОСШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ І СЬВЯДОМАСЬЦІ РАБОЧЫХ МАС

Пераважная большасьць выбраных дэпутатаў—ударнікі-байцы за справу Леніна

Т. т. Сталін, Молатаў, Кагановіч і Варашылаў —ганаровыя члены гарсавету

З вялікім уздымам прайшоў перавыбарчы сход рабочых пабудовы фабрыкі-кухні і групкому Менбуду. Наказ гарсавету абмяркоўвался вельмі актыўна і дэтальна.

У выступленьнях на наказу рабочыя абяцалі па-бальшавіцку змагацца за выкананьне будаўнічай праграмы і прапанавалі гарсавету грынець меры, каб забясьпечыць будаўніцтва матар'ялямі.

У наказ уключаны дадаткі: працягнуць работу трамваю да 2 гадзін ночы, пабудаваць дом-камуну, адкрыць парк культуры і адпачынку, абавязкова скончыць у 1931 годзе пабудову фабрыкі-кухні, арганізаваць закрыты разьмеркавальнік для будаўнікоў.

Гарсавет сваім кіраўніцтвам павінен забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне прамфінплану трэцяга году пяцігодкі.

Пасьля ўсебаковага абгаварэньня кандыдатур, рабочыя-будаўнікі выбралі ў Менгарсавет: т. т. Казлова — рабочага, прамізнанага ўдарніка з 20-гадовым вытворчым стажам, Кугута — ударніка з 15-гадовым вытворчым стажам і Дзйча, сакратара парткалектыву Белдзяржбуду. Кандыдатам выбран т. Качарскі, ударшк, член камсамолу.

Пад бурныя воплескі ўсяго сходу выбраны гапаровымі дэпутатамі Менгарсавету т. т. Сталін, Кагановіч, Молатаў, Варашылаў, Тэльман і Ленскі.

М. Сакалоўскі.

На выбарчы сход хлебазаводу зьявілася 100 проц. рабочых

100 проц. рабочых і служачых менскага хлебазаводу зьявілася на перавыбарчы сход. Вельмі ўважліва, пры вялікай актыўнасьці выбаршчыкаў, абмяркоўвўся наказ гарадзкому савету 13 скліканьня.

Рабочыя хлебазаводу патрабавалі пашырыць транспарт МЦРК, палепшыць санітарны нагляд за харчовымі прадпрыемствамі, пляны жыльлёвага будаўніцтва абмяркоўваць на рабочых сходах, у мэтах узмацненьня абароназдольнасьці краіны будаваць газгасгаховы на заводах.

Дэпутатамі ад хлебазаводу ў гарадзкі савет паслыцца:

Т. т. Кеніс—старшыня гарадзкой КК, член КП(б)Б з 1904 году, былы дырэктар хлебазаводу; Грабавец—стары рабочы-кацагар, прамізваны ўдарнік, член КП(б)Б.

Кандыдатам у гарадзкі савет выбрана старая работніца тав. Серая, лепшая ударніца хлебазаводу.

Брыгадзір АГРАНАЎ.

Кіраваць барацьбой за прамфінплян

Амаль у поўным складзе сабраліся на перавыбарчы сход рабочыя гарбарна-галянтарэйнай фабрыкі «Ўсход». Абгаварэньне наказу прайшло вельмі актыўна, ва ўмовах жорсткай самакрытыкі недахопаў у рабоце гарсавету.

Рабочыя фабрыкі лічаць, што новы гарсавет павінен цесна зьвязацца з прадпрыемствамі, кіраваць іх барацьбой за прамфінплян, часьцей рабіць справаздачы на фабрыках і заводах.

У Менгарсавет выбраны 3 дэпутаты і 2 кандыдаты, сярод іх лепшыя ўдарнікі фабрыкі т. т. Керкіна і Ясінскі.

Выбраныя ў гарсавет дэпутаты запэўнілі сход, што яны зробяць усё магчымае, каб выканаць наказы рабочых, каб перабудаваць работу гарсавету.

І. Партной.

Перавыбары гарсавету ў Бабруйску

БАБРУЙСК (Наш кар.). 15 сьнежня адбыліся перавыбары гарсавету ў групкоме № 18 саюзу будаўнікоў. Сход быў скліканы ў другі раз, бо на першы сход зьявілася ня больш 40 проц. выбаршчыкаў; зараз прышло 75 проц.

У спрэчках на дакладу рабочыя адзначылі, што гарсавет дрэнна кіраваў работай казнярэнцы, быў слаба зьвязаны з прадпрыемствамі, мала клапаціўся аб выкананьні прамфінплану, дапускаў правапартуністычную практыку ў падатковай рабоце; з 5 дэпутатаў і 2-х кандыдатаў, выбраных рабочымі-будаўнікамі, працавалі толькі 3.

Я. КАГАН.

Пад знакам узросшай актыўнасьці мас

ВІЦЕБСК (Наш кар.). Выбары ў Віцебскі гарадзкі савет канчаюцца. Кампанія праходзіць пад знакам значна ўзросшай актыўнасьці рабочых мас. На фабрыцы «Дзьвіна» да наказу гарсавету дадана 500 прапаноў, на панчошнай—300; у часе перавыбараў 1.500 рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі, 70 пешых рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Траба адзначыць, што дэкаторыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі апартуністычна недаацэньваюць значэньня перавыбараў. З 90 перавыбарчых сходаў сарвана 10. Асабліва нездавальняюча праходзяць перавыбарчыя сходы ўтрымаўцаў рабочых. Па саюзе тэкстыльшчыкаў з 150 членаў сем'яў зьявілася на сход толькі 2. У саюзе будаўнікоў перадалі позвы нават пазбаўленым права голасу, бо няма ў саюзе дакладнага ўліку выбаршчыкаў. На дражджавым заводзе сход сарваўся з-за нядбалага дакладчыка.

Прэзыдыум ГарКК пастанавіў вывесьці са складу прэзыдыуму гарсавету т. Когана, які адмовіўся ад даручанага яму дакладу, зрабіў палітычна нявытрыманую, апартуністычную справаздачу на сходзе работнікаў ЦРК і абвінавачваў у апартунізьме супрацоўнікаў, якія выступалі з самакрытыкай і ўносілі прапановы ў паказ.

Б.

Менск ня мае камунальнай пральні

Па 5 месяцаў валяецца брудная бялізна заказчыкаў

Гарсавет павінен пабудаваць новую мэханізаваную пральню

У 1931 годзе ў прамысловасьць БССР павінна быць упягнута 25.000 жанчын. Перад усімі арганізацыямі стаіць надзвычай адказная задача—стварыць умовы, якія-б спрыялі ўцягненьню жанчын у вытворчасьць.

На гэтым пытаньні ЦВК СССР 10 студзеня 1931 году даў наступную дырэктыву: «Наркамправы СССР у двухмесячны тэрмін распрацаваць сыстэму мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі шырокае ўцягненьне жанчын у вытворчасьць». Трэба стварыць такія бытавыя ўмовы (пабудаваць сталовыя, ясьлі, дзіцячыя сады, пральні), якія-б дазволілі вызваліць жанчыну ад малапрадукцыйнай, прытупляючай працы ў хатняй гаспадарцы.

У прапановах да наказу гарсавету амаль на ўсіх рабочых сходах фігуруе гарадзкая пральня, якая працуе з рук вон дрэнна. Гэтымі днямі брыгада «Зьвязды» праверыла, як абслугоўвае камунальная мэханічная пральня прапоўнае насельніцтва г. Менску.

Выявілася, што работа пральні зусім нездавальняе запатрабаваньняў насельніцтва. На 5 месяцаў валялася ў ёй брудная бялізна. Пральня не спраўляецца выканаць заказы. Адміністрацыя знайшла выхад у тым, што ня прымае зараз бялізны ад адзіночак, а толькі ад розных арганізацый. Але ёсьць выпадкі, калі і бялізну, прынятую ад арганізацый, трымаюць па два і больш месяцаў. Напрыклад, халаты, прынятыя ад фабрыкі цукерак «Камунарка» ляжалі нямытымі каля 4 месяцаў, а рабочыя навіны працаваць у брудным спэцвопратцы. Назіраюцца і частыя прастоі пральні.

Якія прычыны дрэннай работы адзінай у горадзе мэханічнай пральні? Папершае, нездавальняючае, апартуністычнае кіраўніцтва адміністрацыі. Працуе ў пральні 87 работніц. Ёсьць наўцая мачымасьць мыць штодзень 8.000 штук бялізны. Абкамтрэст даў пральні кантрольныя лічбы, якія прадугледжваюць мыцьцё 6.900 штук. Рабочыя высунулі свой сустрэчны пляны—мыць 7.500 штук, але «трыкутнік» пральні ня прыняў сустрэчнага пляну рабочых. Старшыня заўкому Шамецька і дырэктар Агол давялі да рабочых апартуністычны плян адміністрацыі і выдалі яго, за «сустрэчны» прамфінплян.

— У нас уся пральня лічыцца ўдарнай,—заявіў брыгадзе «Зьвязды» член мясцкому т. Вінаград. Гэтага ўдарніцтва ў рабоце зусім не адчуваецца. Работніцы працуюць вельмі дрэнна. Ня выконваецца нават апартуністычны плян адміністрацыі—амаль на 2.000 шт. у дзень.

Работніцы расказалі брыгадзе, як праводзілася ў пральні кампанія разгортваньня сапсаборніцтва і ўдарніцтва. Прышлі кіраўнікі са сьпісам і прапанавалі кожнай паасобку: «Жадаеш працаваць, ня хочаш, каб цябе выгналі з пральні—запішыся ва ўдарніцы. Ну значыць і запісалася, ніякіх канкрэтных абавязкаў на сябе ніхто ня браў».

Зусім зразумела, што пры гэтакіх мэтадах, калі адміністраваньне падмяняе масавую работу, сапсаборніцтва існуе толькі на паперы і ня можа даць ніякіх станоўчых вынікаў. Да гэтага трэба дадаць, што культмасавая работа ў пральні адсутнічае, што 50% работніц ня пісьменныя, што грамадзкія арганізацыі бязьдзейнічаюць.

* * *

Менскі гарадзкі савет пачаў будаўніцтва новай пральні, але ўжо з першага погляду відаць, што будынак пральні зусім не адпавядае свайму прызначэньню—гэта хутчэй барак, чым дом. Тыя, хто праектавалі пабудову новай пральні, зусім ня думалі аб тым, ні зможа яна абслугоўваць патрэбы насельніцтва.

Траба, каб гарсавет 13 скліканьня, які зараз выбіраецца, неадкладна заняўся пытаньнем палепшэньня работы і панаўраньня існуючай пральні, а таксама пабудовай новай пральні.

Брыгада «Зьвязды»:
МАНЬКОЎ, ГАРЭЛІКАЎ, АГРАНАЎ.

Паведамленьні

— **Менскі Гарсавет Асоавіяхіму.** 30-31 студзеня ў 11 гадз. раніцы (пакой 14) нараду па пытаньнях пастаноўкі партвучобы па радыё. На нараду выклікаюцца наступныя т. т.: Салоўскі, Масевіч, Наўмёнак (Белрадыёцэнтр), Макоўскі (Камуна), Васілевіч (Усебеларуская саўпартшкола), Пятушкоў (Менск. гаркам КП(б)Б), Баброў (Гомельскі гаркам КП(б)Б) і Праканчук (секцыя навуковых працаўнікоў).

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз. адбудзецца даклад т. Валасевіча для слухачоў начатковых школ «Народна-гаспадарчы плян на 1931 г.». Пасьля дакладу—кіно-фільм «Рубікон». Білеты па школах і ў гаркоме КП(б)Б.

— **БАН.** У 19 гадз. адбудзецца закрыты сход яч. КП(б)Б БАН. Прысутнасьць усіх партыйцаў абавязкова.

— **НК РСІ БССР** у 18 гадз. склікае нараду рацыяналізатараў усіх цэнтральных і гарадзкіх устаноў, у тым ліку і рацыяналізатараў на кіраўніцтве з абʼяднаньняў, трэстаў, прадпрыемстваў, членаў АРУ і работнікаў па кантролі выкананьня па пытаньні аб выніках Усесаюзнай нарады па палепшэньні дзяржапарату. Нарада адбудзецца ў пам. малой залі клюбу харчавікоў (вул. Камс. і Інтэрн. вул.). Уваход вольны.

Папраўка

У «Зьвязьдзе» № 25 ад 27 студзеня ў пастанове бюро Менгаркому і прэзыдыуму ГКК КП(б)Б аб апартуністычнай справаздачы гарсавету, па віне друкарні перабліпаны абзац — пункт «б». Апошні трэба чытаць так: «што нібы заработная плата швэйлікам і дрэваапрацоўшчыкам, якая няўхільна расла і расьце побач з заработнай платай ўсёй рабочай клясы, — зьнізілася ў параўнаньні з 1928 годам».

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і канцылярыя канторы Менск, Савецкая, 83.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абвестак	7-81

Умовы падпіскі
(з дарожным дадаткам „Пра праўх")

На 1 мес.	— 1 р.
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту — 50 к., ніжэй гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўнасьці тэксту—у два разы даражэй. Кантакторнага рахунак выдавецтва № 52|100501 у Дзяржбанку.

Абвесткі прымаюцца ў канторы выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 83, 2-гі паверх, тэл. 7-81.

Усім парткалектывам і ячэйкам.
Згодна пастановы бюро гаркому ад 12 студзеня, першыя арганізацыйныя заняткі на вячэрніх курсах гарпартактыву АДБУДУЦЦА СЕНЬНЯ у 7 гадз. веч., у залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх). Усе таварышы, якія вылучаны яч. ёкамі на курсы і якія запісаліся, павінны зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
29 студзеня, 1 лютага
ДВА вялікія сымфанічныя КАНЦЭРТЫ
з складзе 60 чал. Пад кіраўніцтвам дырыжэра-кампазытара заслужанага дзеяча мас тацтва Р. М. ГЛІЕРА
Праграма канцэрту: творы Глієра. 1-е і 2-е сымфоніі, матрэсаў „Золотко", „Красный мак" і інш. Білеты продаюцца выключна для членаў прафсаюзаў у раб. касе з 12—2 і 4—6 гадз., у касе тэатру з 12—2 і з 5—9 гадз. Пачатак у 9 гадз.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня, 28 студзеня—для саюзу будаўнікоў „ПЕРШАЯ КОХЧАЯ"
Пачатак у 8 гадз. веч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Лепшы савецкі фільм вытворчасьці Саюзкіно (трэсту Белдзяржкіно) РУБІКОН драма ў 7 частках
Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 хв., 10 г. 30 хв.
Каса адкрыта з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
ВЕЧЕР З ГАРОГАМ кіно-аповесьць з 7 ч.
Зьмяні праграмы ВІЛІКІ КАМЕДЫЯНТ ЖІГІЛЬ КЕКПЭР—лепшы сатырык
2 ЖЕРВО 2— ТАНЦ-ЖОНГЛЕРЫ
Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м., і 10 г. 20 м.
Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал"
Новы фільм ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ
Зьмяні праграмы: КІНОНАРЫС у 2-х ч.
Наш уклад у пяцігодку
Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.
Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Гігантары"
Амэрыканскі прыгодніцкі фільм НАЧНЫ КРЫК
Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 „, 10 г. 30 м.
Каса адкрыта—з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр"
Лепшы гістарычны фільм вытворчасьці „Совкино" ДВА БРАТЫ ВІКІ
у 6 частках
Пачатак сэансаў у 1 гадз. дня
Каса адчыненая з 12 гадз. дня.
З панядзелка, 26 студзеня Ленін Барацьба гігантаў
драма ў 10 частках.
Пачатак сэансаў: 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—11 г.
Каса—з 5 гадзін.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ўсіх устаноў і прадпрыемстваў, ШТО АБ'ЯДНАНЬНЕ „БЕЛУЦІЛЬ", згодна пастановы Наркамгандлю, ПЕРАЕХАЛА У ВІЦЕБСК.
Па ўсіх справах належыць зварачацца па адрасе: Віцебск „Белуціль".

САЧЭЦЕ ЗА РЭКЛЯМАЙ!
СКОРА! ЛЕПШЫ ФІЛЬМ СЭЗОНУ
САПРАЎДНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА Сэктар кнігараспаўсюджваньня
Да ведама школ і настаўнікаў
ВЫШЛІ З ДРУКУ:
Першы ўсебеларускі зьезд па палітэхнічнай асьвеце
(Матар'ялы і рэзалюцыі). Стар. 84. Ц. 35 к. Тыр. 10.000.
Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і крамах спажыўкааперацыі.

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ
ПАВЕДАМЛЯЕ,
што з 1-га лютага г. г. адкрываецца
менскае аддзяленьне Дзяржбанку,
апэрацыі якога будуць праводзіцца ў будынку Белканторы Дзяржбанку (1-шы паверх)
У сувязі з перадачай рахункаў новаму аддзяленьню, 31-га студзеня бягучая праца ў банку ПРАВОДЗІЦЦА НЯ БУДЗЕ, за выключэньнем прыёмкі выручкі ад МЦРК.
Адміністрацыя.

Менская Гарадзкая Ашчадкаса
даводзіць да ведама асоб, якія падпісаліся на взлёсыпэдныя абавязацельствы 1-й сэрыі, што Менскае дэпо ДЗЯРЖШВЭЙМАШЫНЫ праводзіць
датэрміновую выдачу взлёсыпэдаў
па поўнасьцю аплачаных абавязацельствах 1-ай сэрыі
Падпісчыкі, якія жадаюць датэрмінова атрымаць взлёсыпэды, павінны поўнасьцю пагасіць увесь кошт взлё-абавязацельстваў, пасьля чаго ім будуць выданы взлёсыпэды.
МЕНГАРАШЧАДКАСА.

Агітмасавы аддзел ЦК КП(б)Б скліча на 2 лютага
НАРАДУ ЖАНАРГАНІЗАТАРАЎ усіх РК і ГК КП(б)Б
з наступным парадкам дня:
1) Вынікі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б.
2) Раз'ярваньне калектывізацыі, весьнавая сяўба, задачы агітмасавай работы сярод калгаснікаў і працоўных сялянаў.
3) Чарговая задача агітмагавай работы сярод работніц і жонак рабочых у 3-м годзе пяцігодкі.
4) Вынікі справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў.
5) Задачы масавага жаночага друку ў 3-м годзе пяцігодкі і работа з рассельскорамі.

Сёньня, 28 студзеня, у 7 гадз. вечару
У ДОМЕ АСЬВЕТЫ адбудзецца
ІНСТРУКЦЫЙНАЯ НАРАДА
па'пяджаючых у работы па правядзеньні „дэкады ш учыту" сваіх рыў па ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі непісьменнасьці.
Матар'ялы і мандаты ва'ядзяючым будуць выдавацца на гэтай нарадзе.
БДВ, Белкаапсаюзу, Дзяржплану, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ Белкустпромсаюзу і сэкцыі навуковых працаўнікоў прыбылаць на нараду вылучаных таварышоў.
КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б

Менгарком КП(б)Б сумесна з ЦСПСБ
назначае на 2-II-31 г., а 7 г. веч. у доме Камасьветы (Клюб К. Маркса)
зьлёт прэміраваных рабочых
прадпрыемстваў гораду
за першыя два гады пяцігодкі,
з парадкам дня:
Задачы прэміраваных рабочых у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі
Білеты на зьлёт сакратарам ячэек атрымаць у Гаркоме да 31-I-31 г. (пакой № 10).
Менгарком КП(б)Б і ЦСПСБ.

30 студзеня г. г., а 7 гадз. веч. у памяшк. Гаркому
КУЛЬТПРОПАМ ГАРКОМУ СКЛІКАЕЦЦА
агульна-гарадзкая нарада ўпаўнаважаных ячэек КП(б)Б і парткалектываў па вышэйшы газэт і журналаў.
Яўка абавязкова.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
Сэктар кнігараспаўсюджваньня.
ВЫШЛА з ДРУКУ
Н. Радзееў.
Элемэнтарная мэханіка
384 ст. Цана 2 р. 75 к. Тыр. 3.000.
Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і крамах спажыўкааперацыі.

ВЫШЛА З ДРУКУ, РАЗАСЛАНА ПАДПІСЧЫКАМ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ
— ЧАСОПІС —
„Беларуская Работніца і Сялянка"
№ 1 студзень 1931 г. № 1

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ
Да 50-цігадовага юбілею т. ВАРАШЫЛАВА.
ВЫШЛІ З ДРУКУ:
Алтайскі.—ВАРАШЫЛАЎ (паэма).
Стар. 152. Цана 1 р. 10 к.
Варашылаў.—СТАЛІН І ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ.
Стар. 44. Цана 10 к.
Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва і крамах спажыв. кааперацыі.

ГЭТЫМ ПАВЕДАМЛЯЮЦЦА ЎСЕ СПАЖЫЎЦЫ ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ
як для матораў, так і для асьвятленьня (апошнім пачынаючы ад 5 квт. або 5.000 сьвечак), што яны павінны ў дэкады т рмін са дня апублікаваньня гэтае абвесткі прадставіць ЭЛЬВОДУ ВЕСТКІ па ніжэйнаступнай форме:

Назва спажыўца	Адрас	Патрэбна вольт магутн. у квт.				Падлягае ўстан. у 1931 г.				Мяркуецца ўстанавіць у 1932 г.			
		Матор.		Лямп.		Матор.		Лямп.		Матор.		Лямп.	
		Кол.	Маг.	Кол.	Маг.	Кол.	Маг.	Кол.	Маг.	Кол.	Маг.	Кол.	Маг.
Кольн. зьмен.		Режым працы				Патрэбн. магутн. максім.							
		Пачатак	Канец			1931 г.		1932 г.					
						Мат.	Лямп.	Мат.	Лямп.				

У паказанай форме ўлічваюцца асобна існуючыя або намыраныя прадпрыемствы і новыя. Прадстаўленьне вестак мае мэтай устанаўленьне правільнага рэжыму працы электрастанцыі і выяўленьня рэальнага запатрабаваньня ў энэргіі на бліжэйшыя гады, чаму і зацікаўлена абавязковым. Ухіліўшыяся ад рэгістрацыі аўтаматычна ня будуць уключаны ў сьпіс спажыўцоў.
ДЫРЭКТАР ЭЛЬВОДУ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на часопіс ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК
Падпісная цана ў м-ц 20 кап.

ВЫШАЎ З ДРУКУ,
разасланы падпісчыкам і паступіў у продаж
№ 8-9 БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ № 8-9
ЗЬМЕСТ:
ПЕРАДАВАЯ. Барацьба на два фронты ў нацыянальным пытаньні—барацьба за дыктатуру пралетарыяту.
Н. КРАСІНА. Аб нацыяналізаваным на ізьме.
А. СЯНКЕВІЧ. Клясавая барацьба ў беларускай літаратуры.
О. КАНАКОЦІН. Абвастрэньне клясавай барацьбы ў беларускай літаратуры ў перыяд сацыялістычнай рэканструкцыі.
ШЧАРБАКОЎ. Пытаньні культуры і асьветы на XIII зьезьдзе КП(б)Б.
Г. БОНДАР. Аграрная палітыка беларускай кадрацьцеўшчыны.
ПОТАШ. Аб вывучэньні гісторыі КП(б)Б і падрыхтоўкі кадраў у гэтым абсягу.
П. КОРЧЫК. V зьезд камуністычнай партыі Польшчы аб нацыянальна-вызваленьчым руху.
Матар'ялы і дакумэнты
Нацыянально-вызваленьчы рух і задачы партыі.
Крытыка і бібліяграфія
Аб двух памылковых артыкулах у «Бальшавіку Беларусі».
Л. ЯКАЎЛЕЎ. Клясавы твар беларускага нацыянал-дэмакрата.
ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА 1931 г.
Новы падпіскі:
На год—(12 нумароў)—4 р. 20 к. | На 3 мес. . . 1 р. 05 к.
На 6 мес. . . . 2 р. 10 к. | На 1 мес. . . . — 35 к.
Падпіска прымаецца ўсімі паштовымі аддзяленьнямі і лістаносцамі.

МАШЫНІСТКА, якая добра ведае беларускую мову ПАТРАБУЕЦЦА
разасланы газэты „Зьвязда". Звяртацца да сакратара рэдакцыі з 5 да 8 гадз. штодзённа.

Мяняю квэтэру
з 2-х пакояў 38 кв. мэтр. у Бабруйску у цэнтры на 1-2 пакоі ў Менску. Запытацца ў Белдзяржграфабʼяднаньні вул ВСНГ (пакой № 5).

У выпадку незкуратнага атрыманьня газэты ЗЬВЯНЕЦЕ па тэлеф. № 15-42

Менск, друкарня «ЗЬВЯЗДЫ».

Менск, Гаматдрукбел № 837.